БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

конкурс
для
вучняў

# ВЕЦЕР СВАБОДЫ

Зборнік конкурсных прац



Мінск
2006

*Дзякуем усім тым, хто паспрыяў правядзенню конкурса
і выданню гэтай кнігі*

**Над кнігай працавалі:**
Вацлаў Арэшка
Ларыса Андросік
Ірына Коваль
Юлія Андрэева

© Блізкая гісторыя, 2006

# Змест


Ад «БЛІЗКАЙ ГІСТОРЫІ» _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ 4

Свабода... Што гэта значыць? _ _ _ _ _ _ _ _ 6

Нам свабоды хапае _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ 24

Я за свабоду! _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ _ 29

# Ад «БЛІЗКАЙ ГІСТОРЫІ»

На пачатку 2006 «Блізкая гісторыя» абвесціла конкурс «Вецер свабоды». Пакуль доўжыўся тэрмін конкурсу, шмат што адбылося ў Беларусі. Краіна прайшла сапраўднае выпрабаванне ветрам свабоды. Гэта не магло не паўплываць на перакананні і думкі аўтараў. Пасля сакавіцкіх шквалаў, пасля пляца Каліноўскага раптоўна пайшла новая хваля цікавых і напоўненых жывым пачуццём свабоды прац. Мы трохі прадоўжылі тэрмін конкурсу і атрымалі больш за 200 эсэ з розных куткоў нашай краіны. Відавочна, тэма кранула: значыць, мы не памыліліся з яе выбарам, значыць, наша моладзь неабыякавая да тэмы свабоды.

Працы вельмі розныя. Ёсць зробленыя спехам, ці «па шаблоне», ёсць літаратурныя спробы, нямала сур'ёзных, з выкарыстаннем крыніц, цытат і малюнкаў. Вельмі рознае і бачанне свабоды — часам супрацьлеглае. Гэтая разнастайнасць, на нашу думку, вельмі добрая з'ява: яна паказвае неабыякавасць канкурсантаў. Моладзь больш яскрава, шчыра, без штучнай аднадумнасці разважае пра лёс грамадства і асобы, хай сабе і трохі наіўна.

Вялікай праблемаю было адабраць лепшыя працы. Мы вырашылі не вызначаць першыя ці другія месцы і палічылі, што ўсе эсе, якія трапілі ў зборнік права, вартыя ўвагі. Надрукаваць болей не дазволілі абмежаваныя памеры кнігі. І тыя працы, што патрапілі, прышлося скарачаць, каб даць месца большай колькасці галасоў.

Каб працы лепш успрымаліся, мы расклалі іх на тры раздзелы. Асноўны прынцып — падыход аўтараў да паняцця «свабода». У першым раздзеле — гэта тыя, хто ўнікліва шукае, што значыць «свабода» для яго, для яго пакалення, для грамадства. Тут няма канчатковых вынікаў, перакананых заяваў. Другі раздзел — упэўненыя ў тым, што свабода павінна быць рэгулявана дзяржаваю, што той свабоды, якую яны сёння маюць, цалкам дастаткова для іх гарманічнага развіцця. Трэці — тыя, каму мала свабоды, хто прагне яе, нават не як ветра, а як паветра, і гатовы працаваць і змагацца за «вашу і нашу свабоду». Што лепш? Чытайце, думайце, разважайце.

Але гэта кніжка не толькі для таго, каб пазахапляцца юнацкай фантазіяй. Мы лічым, што галасы маладых надзвычай важныя. Сёння яны яшчэ не ўдзельнічаюць у выбарах ці рэферэндумах, але гэта іхныя галасы — за тую будучыню, за тую Беларусь, у якой яны хацелі б жыць. Калі ласка, палітыкі,

аналітыкі, грамадскія лідэры, журналісты — усе, хто бярэцца за будоўлю беларускай будучыні, улічыце галасы яе грамадзянаў.

Дзякуем усім, хто паразважаў, паспрачаўся, памроіў. Спадзяёмся, што будзем сябраваць і надалей гаварыць з вамі пра свабоду, пра шчасце, пра сумленне, пра прызначэнне чалавека.

*Вацлаў Арэшка*



# Свабода... Што гэта значыць?

## ЗРАБІ СВОЙ ВЫБАР!

**Паліна Губашына**
**г. Мар’іна Горка**

Сонейка. Шчырае, светлае. Вецер. Бадзёры, рашучы. Дождж. Цёплы, мяккі, ласкавы. Менавіта такія асацыяцыі заўсёды нараджаліся ў маёй галаве пры слове «свабода». З цягам часу іх месца заняў рашучы чалавек са змрочным тварам і мячом у руках, які стаяў на сцюдзёным ветры ці то на нейкім полі, ці то дзесьці ў балотах, ці то на нейкай гары, ці ў княстве якім. Але і яго з цягам часу паступова пачала выціскаць постаць нейкага зусім іншага чалавека (яшчэ нават не бачна, мужчына гэта ці жанчына), які стаіць на скрыжаванні дарог сярод шматпавярховых дамоў. Але гэты вобраз яшчэ не зусім сфарміраваны, і таму часцей за ўсё мае думкі звяртаюцца да ранейшых. Робячы спробы знайсці «твар» новага вобраза, я зацікавілася іншым пытаннем: а што думаюць пра гэта мае сябры? Я папрасіла некаторых з іх, розных і непадобных адзін да аднаго, адказаць на маё пытанне, а значыць сказаць, якія асацыяцыі ўзнікаюць у іх пры словах «вецер свабоды». Вось што яны адказалі.

Каця Канавалава (вучаніца XI класа, вельмі любіць праводзіць свой час з сябрамі): «Вецер свабоды — барацьба, мітынгі, нейкія лістоўкі, іх шмат, вельмі шмат. Барацьба за самастойнасць».

Вольга Федарынчык (вучаніца XI класа, збіраецца звязаць сваё жыццё з эканомікай): «Вецер свабоды — гэта, наадварот, нешта даволі лёгкае, шчодрае, мяккае, свабоднае, хвалюючае... Ці, можа быць, смеласць нейкая».

Алёна Федарынчык (яе маці, настаўніца рускай мовы і літаратуры): «Вецер свабоды — адкрытасць, шчасце, свабода, вольнасць. Гэты вецер патрэбны. Гэта размах, раздолле».

Алеся Чмырова (вучаніца XI класа, любіць спорт): «Вецер свабоды — заход, адзінота. Я ўяўляю вецер, моцны. Абрыў, а ўнізе — мора. Але на мо-

ры — штыль, бо вецер не дасягае яго, ён толькі зверху. Але самае галоўнае — гэта чамусьці абрыў».

Ганна Палягошка (вучаніца XI класа, скончыла мастацкую школу): «Вецер свабоды… Праўду сказаць, я не ведаю, што гэта канкрэтна. Магчыма, нешта, звязанае з любоўю, сяброўствам. Без барацьбы. Нешта лёгкае і імклівае. Вялікае сэрца».

Мне было вельмі цікава задаваць гэтыя пытанні розным людзям. Спачатку ў мяне з'явілася думка, што, магчыма, іх адказы будуць рознымі з-за іх узросту, дзейнасці, сацыяльнага становішча ці нечага іншага. Так, некаторыя адказы адрозніваюцца адзін ад аднаго, некаторыя маюць нешта падобнае, але зараз я ўпэўнена, што фактары, на якія я звярнула ўвагу, не такія ўжо і важныя. Нягледзячы на гэта, я яшчэ сумняваюся наконт узросту… Але гэтыя адказы людзі, мне здаецца, давалі больш душой, без апоры на свае прафесійныя навыкі. А душа, як вядома, не мае ўзросту. Але бліжэй да адказаў. Мяне вельмі здзівіла, што многія ўяўляюць нешта добрае пры словах «вецер свабоды». Можа, таму, што яны самі не змагаліся за свабоду і ведаюць аб гэтым толькі з аповедаў іншых людзей і падручнікаў? Ці дае аб сабе ведаць аптымістычны погляд на жыццё? А гэта добра. Ці яны вераць, што сваю свабоду мы ўжо заваявалі? Сустракаюцца і дваякія погляды. У Ганны, напрыклад, прысутнічае дождж. Можа, не ўсе войны яшчэ забыты? А яшчэ я была здзіўлена таму, што для мяне вецер свабоды — гэта толькі барацьба. Да таго ж яна не ўяўляецца хуткай. А вецер для мяне — тое ж самае, што і вецер свабоды. Вось вам розныя людзі, розныя погляды і рознае ўспрыманне жыцця.

А можа, некаторыя людзі так і не вырашылі, што яны лічаць свабодай? Тут я хачу прывесці некалькі вядомых выказванняў.

Если предложить людям выбор между свободой и сандвичем, они выберут сандвич. (Джон Бойд-Орр)

Бываюць і такія выпадкі, што чалавеку вельмі доўгі час не даюць слова сказаць. А яны так жадаюць гэтага! І нават скардзяцца іншым наконт гэтага. І калі раптоўна ім даюць слова, яны і не ведаюць, што сказаць, пачынаюць мітусіцца. І змаўкаюць.

Иные немеют от восхищения, когда у них вынимают кляп изо рта. (Станислав Ежи Лец)

Если бы свободно падающий камень мог мыслить, он думал бы, что падает по свободной воле. (Бенедикт Спиноза)

Наконт апошняга выказвання. Яго я таксама выбрала таму, што яно і сёння актуальна. Некаторымі людзьмі вельмі лёгка маніпуляваць. І хітрыя людзі гэта выкарыстоўваюць. Нагаварыўшы чагосьці, даўшы штуршок, яны прымушаюць гэтых «свабодных» людзей рабіць тое, што ім трэба. А яны і не заўважаюць нічога.

Свобода — это возможность сказать, что дважды два — четыре. (Джордж Оруэлл)

Наогул, я ўсё ж такі думаю, што кожны чалавек павінен сам зрабіць свой выбар. Магчыма, зрабіўшы некалькі памылак, чалавек зможа вырашыць, што для яго значыць гэтае салодкае слова «свабода». Ён зможа вырашыць, за свабоду ён ці не. Рабіндранат Тагор сказаў: «Закройте дверь перед всеми ошибками — и истина не сможет войти». Я згодна з ім. Кожны сам зробіць свой выбар. Але мяне хвалюе яшчэ адно пытанне. Нават не дае займацца іншымі справамі. Хтосьці скажа: «Выбірайце свабоду!» А я адкажу словамі Фрыдрыха Ніцшэ: «Ты называешь себя свободным. Свободным от чего или свободным для чего?»

## ВОСЬ ЯКОЕ Ў МЯНЕ РАЗУМЕННЕ СВАБОДЫ

**Ірына Казлова**
**г. Мінск**

Я лічу, што сёння свабода адыгрывае вялікую ролю ў грамадстве. Людзям амаль усё дазволена, але яны не маюць свайго слова. На мой погляд, некаторыя з нас хацелі б размаўляць на сваёй роднай мове, але ў іх няма магчымасці гэта рабіць, таму што людзі будуць здзекавацца з іх, а не кожнаму гэта прыемна.

Таму амаль усе беларусы размаўляюць па-руску. Але мне шкада некаторых слоў. Здаецца, мы вінаватыя перад імі, як перад людзьмі, якіх незаслужана пакрыўдзілі.

Сёння вельмі шмат свабоды, таму людзі дазваляюць сабе многае: яны могуць пакрыўдзіць адзін аднаго, здзекавацца з сабе падобных, размаўляць вельмі дрэнна і гэтак далей. Азірнёмся наўкол. Як часта сустракаюцца людзі хваравіта раздражнёныя, з неадэкватнай рэакцыяй на ўсё, нават на дробязі. Аднаго незнарок штурханулі ў аўтобусе, і ён доўга будзе даймаць крыўдзіцеля, а заадно і ўсіх, хто едзе разам з ім. Іншаму зрабілі заўвагу, што ён занадта часта і падоўгу вядзе асабістыя размовы са службовага тэлефона — ён шпурлянуў слухаўку. Трэцяй здалося, што ёй недалілі ў шклянку соку, і яна накінулася на прадаўшчыцу з лаянкаю. Падобныя паводзіны, безумоўна, вынік адсутнасці культуры. Вось чаму, на мой погляд, людзі маюць вельмі шмат свабоды, што ім самім і супярэчыць. Вось якое ў мяне разуменне свабоды ў грамадстве.

# ЦУДОЎНАЕ СЛОВА

**Таццяна Клёў**
**г. Мінск**

Цікава, ці разважаў хто-небудзь калі-небудзь пра сэнс гэтага слова і ці спрабаваў спазнаць, вымаўляючы яго, увесь сэнс? Можа, для некаторых слова «свабода» нічога не значыць, бо яны не думалі над ім і для іх гэта глупства. Для мяне ж гэта слова значыць шмат. Яно раскрывае шмат таямніц і цудаў.

Быць свабодным — значыць ні ад каго не залежаць, рабіць, думаць, гаварыць тое, што хочацца (у межах разумнага, канешне), нікога не баяцца, хадзіць з высока ўзнятай галавой. Хіба гэта не цуд?

Адным з найважнейшых цудаў ёсць чалавечая свабода, і каштоўней за гэта нічога няма. Нішто так не ўплывае на жыццё чалавека, як свабода і гарманічныя адносіны з людзьмі, самім сабой, душэўная незалежнасць ад іншых.

Калі чалавек свабодны, ён падобны на птушку. Перад ім расчыняюцца ўсе дзверы і магчымасці.

Ніхто не можа адняць душэўную свабоду чалавека, акрамя яго самога. Свабоду нельга купіць або прадаць. Яна вышэй за ўсё гэтае. Яе нельга бачыць, але яе можна адчуць. Гэта як ветрык, якога мы не бачым, але адчуваем. Калі ў чалавека няма свабоды, ён не зможа жыць і мець адносіны з тымі, хто побач, будзе пакутаваць. Яна нібы птушка, якую трымаюць у клетцы, не выпускаючы і не даючы размаўляць з сабе падобнымі.

Усё гэта змяшчае ў сабе слова «свабода». Усяго сем літар, а такі шырокі сэнс! Згубіўшы свабоду, губляеш частку сябе, замыкаешся і знікаеш. Той, хто не шкадуе яе, той яшчэ ўзгадае аб ёй. Але калі свабоды няма, яе не згубіш, бо нельга згубіць тое, чаго няма.

# ЯК МЫ ЎЯЎЛЯЕМ САБЕ СВАБОДУ?

**Ганна Лагодзіч**
**Расонскі раён, в. Сяляўшчына**

Паняцце «свабода», як мне здаецца, існуе з тых часоў, як чалавек адчуў сябе чалавекам. Гэта слова ёсць ва ўсіх мовах свету. Але што значыць «свабода»? Што значыць «быць свабодным»? Аб гэтым чалавек разважаў з часоў старажытнасці і яшчэ ў антычнасці прыйшоў да высновы: «Каб быць свабодным, трэба падпарадкоўвацца законам».

Але ці так мы ўяўляем сабе свабоду? Мне, напрыклад, здавалася, што свабода — гэта калі робіш, што хочаш, ідзеш, куды хочаш… Але антычны чалавек разумеў свабоду як падпарадкаванне законам. Мала гэтага, але так свабоду ўспрымалі і ў іншыя эпохі. Напрыклад, рускі пісьменнік Ф. Дастаеўскі пісаў: «Свабода не ў тым, каб стрымліваць сябе, а ў тым, каб валодаць

сабой». А мне ўвесь час здавалася, што сэнс свабоды заключаецца ў тым, каб не стрымлівацца ні ва ўчынках, ні ў праявах эмоцый. Зараз жа, на парозе самастойнага жыцця, я хачу знайсці адказ, што такое свабода.

Для мяне свабода — гэта права, якое належыць чалавеку ад нараджэння. Са свабодай я звязваю ажыццяўленне сваіх жаданняў і планаў, магчымасць па ўласнай волі выбіраць жыццёвыя мэты і шляхі іх дасягнення. Але, каб дасягнуць мэт, трэба мець свабоду дзеянняў. Свабодна дзейнічаць — гэта значыць заўсёды ліквідаваць абмежаванні і забароны, пераадольваць перашкоды. Але ў свабоды таксама ёсць свае межы. Быць свабодным — гэта не значыць дзейнічаць па прынцыпе «ўсё дазволена». Гэта пазіцыя нястрымнага свавольства, эгаізму і разбурэння; гэта дзеянні не толькі амаральныя, але часам і злачынныя. Свабода павінна быць для кожнага чалавека толькі пазітыўнай. Гэта калі чалавек становіцца асобаю, рэалізуе ўсе свае здольнасці, узбагачае духоўны свет. Кожны з нас павінен дасягнуць асабістай свабоды і стаць чалавекам. Але гэта можа быць толькі тады, калі мы будзем валодаць сабой і залежаць толькі ад законаў.

## СВАБОДА… У РОЗНЫХ ЯЕ ПРАЯВАХ

**Альдона Мартыненка**
**г. Мінск**

### Уступ

Свабода… Што такое свабода? Многія людзі кажуць: «Я люблю свабоду». Але большая частка гэтых людзей нават не разумее, што такое свабода. Свабоды ў чыстым выглядзе бадай што не існуе. У любым выпадку для поўнай свабоды патрэбны нейкія ахвяры. А якая ж гэта тады свабода? Некаторым людзям проста прыемна думаць, што яны свабодныя.

Важней за свабоду няма нічога, і ў той жа час усё важнейшае за свабоду. Калі ў нас няма нічога, мы ні перад чым і ні за што не адказныя, тады нам здаецца, што мы свабодныя, але ў такой сітуацыі (калі нічога няма) мы адчуваем пакутлівасць паўсядзённых патрэб, і ўжо тут думкі аб тым, што ты свабодны, нават не ўзнікаюць.

Мне здаецца, што я магу сказаць: «Я — за свабоду». Але кожны чалавек па-свойму асэнсоўвае свабоду. Хтосьці чакае ад свабоды самага неабходнага, у чым мы маем патрэбу. А некаторыя чакаюць немагчымага, а потым расчароўваюцца ў свабодзе.

### Гісторыя свабоды

Гісторыя свабоды вельмі цікавая, захапляючая і доўгая. Я пастараюся пераказаць яе ў кароткай форме. Для прыкладу возьмем славутага беларускага змагара за свабоду Кастуся Каліноўскага. Я думаю, што яго ўсе ведаюць.

У гонар яго названа адна з вялікіх вуліц беларускай сталіцы. Каліноўскі пратэставаў супраць царызму ў Беларусі, хоць ведаў, што расійскі цар яму не даруе. Свабода свайго народа для яго была важней за ўласнае жыццё. На жаль, гэта паўстанне закончылася кепска як для самога Каліноўскага, так і для ўсёй Беларусі. Кастуся Каліноўскага павесілі, а беларускія землі засталіся пад Расіяй.

Іншы вядомы беларускі змагар Тадэвуш Касцюшка. Ён належаў да старажытнага беларускага роду. Яго змаганне за свабоду (ізноў жа не сваю, а свайго краю) пачалося ў сакавіку 1794 года ў старажытнай сталіцы Польскага Каралеўства — Кракаве. Касцюшка быў кіраўніком паўстання. Змагары хацелі выгнаць захопнікаў са сваёй зямлі і аднавіць незалежную Рэч Паспалітую ў яе ранейшых межах. У сярэдзіне мая былі вызвалены ўжо амаль усе землі Вялікага Княства.

Але і гэта паўстанне скончылася не перамогай. Адно прыемна, што Касцюшка ўцёк ад пакарання і яшчэ праславіўся ў Францыі, у Амерыцы.

## Дзе і як існуе свабода

Такім чынам, я не збіраюся аспрэчваць ісціну, што свабода існуе. І гэта нават не толькі змаганне герояў за свой край. Са свабодай сутыкаешся ў кожнай дробязі, але яна не можа існаваць сама ў сабе, асобна ад усяго. Яна заўсёды з чымсьці звязана. Часам нават з нейкімі звычайнымі рэчамі, якія нібыта і не правакуюць думак аб свабодзе. Напрыклад, звычайны кубак на стале. Ён проста стаіць. Хтосьці можа пазайздросціць яму ў тым, што ў яго няма ніякіх абавязкаў. Ён свабодны… і адначасова не — яго ж могуць у любы момант забраць або проста выпадкова скінуць.

## Свабода ў музыцы

Адчуванне свабоды прысутнічае, напрыклад, і ў музыцы. На жаль, у Беларусі цяпер больш папулярная расійская музыка.

<…>

Але чаму беларуская музыка не такая папулярная? Адказ на гэта пытанне можна знайсці ў саміх песнях. Бо ў многіх жа выканаўцаў у галаве ўзнікаюць думкі накшталт гэтай: «За краіну крыўдую, а ў героі не рвусь, бо не цэніць герояў мая Беларусь».

Гэта вынік працы нашых тэлеканалаў і радыёстанцый, якія працуюць чамусьці «з іншым матэрыялам». Нават саму гэтую цытату я ўзяла не з радыё, а з дыска-зборніка «Песні СВАБОДЫ». А што ж радыёстанцыі?! Гэта іх свабода. Але яна забірае маю свабоду мець выбар.

## Пачуць і зразумець

Многія беларускія групы спяваюць пра свабоду тое, што яны думаюць на гэтую тэму, тое, што адчуваюць. Часам яны спрабуюць «адкрыць вочы» слухачам. Але ці ўсе слухачы хочуць разумець тое, што яны нікому не патрэбныя, што яны жывуць у страшным свеце… Магчыма, некаму прыемна зна-

ходзіцца ў пэўным трансе з думкамі аб тым, што ўсё добра. І тут таксама пачынаецца сутыкненне свабод. Вось, напрыклад, украінскі спявак Сяргей Салоный у сваёй «Песні Вечнага Агню» разважае ў даволі жорсткай форме, ён хоча сказаць слухачам, што ў барацьбе за свабоду нават смерці няма, бо «дух не згасае, дух не вмірае».

Кожны разумее свабоду па-свойму. Хтосьці разважае пра яе ў песнях пра вайну, хтосьці — пра палітычнае становішча ў наш час. А вось Тарас Сіленка (група «Каму ўніз») у сваёй жартоўнай песні «Эльдарада» расказвае аб тым, як ва ўсіх людзей «дзесьці ў далёкай краіне» ствараецца ўражанне, што там, невядома дзе, ідэальнае палітычнае становішча: «Там вяліка воля слову, Кожны кажа ўсё, што знае, Ну а потым выпадкова... Памірае! Памірае!». Я рызыкну сказаць, што падобнае становішча і ў нашай краіне. Кожны ў стане асэнсаваць нават некаторыя газетныя публікацыі, радыёпаведамленні і зрабіць пэўныя высновы...

Амаль у кожнай песні пра свабоду (ці ўкраінскай, ці нашай) выразна бачныя сімвалы несвабоды, нявол (кайданы, турма, Сібір), але чамусьці няма адзінага сімвала свабоды (можа, вецер, можа, сонца, можа, яшчэ нешта). Многія модныя групы нават смяюцца з паняцця «свабода», але гэта не значыць, што яны не паважаюць усіх іншых людзей, якія думаюць інакш. Проста яны хочуць зрабіць сваю песню лёгкай на ўспрыманне.

А вось, дапусцім, беларуская група «Партызанская школа» чамусьці па стылі, па манеры выканання і па музыцы вельмі падобная на маскоўскую групу «Многоточие» (я маю на ўвазе толькі песню «Не!»). Іншыя песні ў іх нібыта больш самастойныя, не падобныя на «русских собратьев». Мне і маім сябрам вельмі спадабалася песня «Партызанскай школы», якая называецца «Тваё каханне». Яе перапісвала адзін у аднаго ўся наша гімназія. Гэта песня цікавая і зусім не падобная ні на што. Менавіта таму мне шкада, што іх адзіная песня пра свабоду апынулася пад уплывам тых, хто і пазбаўляе нас гэтай свабоды.

### Свабода ў палітыцы

Наконт свабоды можна паразважаць і пра палітыку. Яна ў нашай краіне не такая кепская, як многія думаюць, бо бывае ж і горш (напрыклад, калі вайна). Але пытанні ўзнікаюць і ў нас.

Чаму ў краіне будуюцца футбольныя манежы, стадыёны, лыжныя комплексы і іншае падобнае, калі многія людзі жывуць на вуліцы, а больш «шчаслівыя» туляцца ў састарэлых і пагнілых кватэрах, хатах без каналізацыі, калі ў многіх навучальных установах ледзь не падаюць сцены і дах (часам нават у прамым сэнсе гэтага слова), калі на некаторыя паліклінікі і бальніцы без слёз не глянеш?..

Хто-небудзь запытаў у людзей, ці трэба ім усё гэта новае? Можа, ім лепей было б, каб адрамантавалі старое? І дзе іх свабода ўплыву на гэтыя праблемы?..

Праўда, некаторыя знаходзяць трыбуну для выказванняў. Як, напрыклад, група «Splenetic» у сваёй песні «Менталітэт»: «Горад мой для мяне

стаў няўтульны, чужы. Я не бачу ў ім свету, я не бачу ў ім шчасця. Любы мой браце, ты мне скажы, чаму няма свята ў нашай хаце, чаму цябе дураць, чаму «абуваюць», чаму у г···е цябе жыць прымушаюць?» Я лічу, што музыканты даволі груба выказваюцца таму, што, калі яны гавораць «нармальна», іх ніхто не слухае, ніхто на іх не звяртае ўвагі, у іх няма свабоды, і яны імкнуцца выказацца так, каб іх усе пачулі.

Цікава, што нават у гэтым выпадку ў палітыкаў атрымоўваецца пераканаць людзей, што ім больш трэба новы стадыён, чым прыгожая адрамантаваная паліклініка, дзе няма чэргаў. І зноў усе застаюцца задаволеныя... але толькі на пэўны час. Пройдзе некаторы час, і людзі зразумеюць, што на стадыён не пойдзеш лячыць галаву або жывот, але нічога ўжо не паробіш.

**Свабода ў падарожжах**

Некаторыя людзі, каб атрымаць адчуванне свабоды, адпраўляюцца падарожнічаць вакол свету. Нібыта добры выхад, але пакуль ты будзеш займацца пакупкай білетаў, візай і іншымі зборамі, прападзе ўвесь настрой і жаданне падарожнічаць. Ці выпадкова ў нас з гэтым так няпроста? Не думаю.

**Экстрым + жыццё = свабода?**

Многія імкнуцца знайсці пачуццё свабоды ў экстрэмальных відах спорту. Але і тут ты да канца не адчуеш яе. Ува ўсіх відах спорту ёсць свае рамкі, абмежаванні. Напрыклад, ты едзеш на гоначнай машыне з велізарнай хуткасцю. Ты можаш ехаць павольней, хутчэй або ўвогуле спыніцца — гэта залежыць ад тваёй волі. Але і тут ты павінен прытрымлівацца маршруту, ты залежыш ад дарогі, ад правілаў, і толькі калі ты ўпісваешся ў гэтыя правілы, тады ты ў пэўным сэнсе свабодны.

**Наркотыкі — не свабода!**

Многія людзі спрабуюць забыць пра рамкі і абмежаванні з дапамогай алкаголю і наркотыкаў. Але гэтым спосабам ты, як белай заслонай, толькі засцілаеш сабе вочы і не заўважаеш былых перашкод да свабоды. Яны не знікаюць, а проста ты іх не бачыш. Калі праз некаторы час заслона спадае, ты бачыш, што праблем пабольшала. Да старых дадаецца новая праблема, якая заключаецца ў тым, што ты апынаешся залежным ад наркотыкаў або алкаголю.

Свабоды не можа быць там, дзе ёсць залежнасць ад чагосьці. Добра пра гэта спявае група «Таварыш Маўзер»: «Далей вада, мокнуць твары, рукі, сцены, калі нешта не так — парві свае вены, але гэта не выйсце, бо выйсце не маюць з нагоды».

Яшчэ лепей аб гэтым узгадаў «UltraВожык» (на дадзены момант адна з самых модных груп у беларускай моладзі). Дык чаму мы не маем свабоды? Таямнічыя хлопцы з «UltraВожыка» тлумачаць гэта па-свойму: «Мы не ідзём у новы дзень на сонца свет, спяшаемся схавацца ў едкі дым ад цыгарэт, запіць сумленне кубкам чорнага віна. Атлантыда кліча нас, а нас няма...»

**Свабода без залежнасці!**

Чым сталейшым становіцца чалавек, тым больш ён залежыць ад чагосьці. Я не хачу сказаць, што з узростам усе людзі пачынаюць піць і «калоцца». Тыя людзі, у якіх нарадзіліся дзеці, становяцца залежнымі ад іх. Любы чалавек, які прыручыў якую-небудзь жывёлу, адказны за яе, а значыць, залежны ад яе. Чалавек не можа абарваць усе адносіны, якія робяць яго залежным ад чаго-небудзь. Дык ці можа ён быць незалежным, гэта значыць свабодным?

**Пачуццё свабоды ў творчых людзей**

Многія творчыя людзі, якія не могуць поўнасцю адчуць свабоду, спрабуюць укласці ўсе свае думкі і пачуцці ў твор. Яны «ствараюць» герояў такімі, якімі яны самі хацелі б быць. Калі яны мараць аб нечым завоблачным, дык стараюцца даць шанец свайму персанажу дасягнуць пастаўленай мэты. Каб твор атрымаўся больш цікавы, аўтар прыдумляе нейкія перашкоды, а бывае, што нават апісвае свае радасці, пакуты і перажыванні. Па фінале апавядання можна зразумець, чага на самой справе хоча аўтар. Калі ў апавяданні няма хэпі-энду, гэта значыць, што пісьменнік ці зразумеў, што яму на самай справе гэта не трэба, ці ў сапраўдным жыцці яму не ўдалося дасягнуць мэты.

<...>

**Свабода ў рэальным жыцці**

Крыху свабодным можна стаць і ў сапраўдным жыцці. Вы, напэўна, бачылі маладых людзей і дзяўчат, апранутых, так скажам, не зусім звычайна і дзіўна. Гэтыя людзі прытрымліваюцца свайго стылю. Ім усё роўна, што пра іх манеры, адзенне і паводзіны падумаюць навакольныя людзі. Для іх не існуе прымхаў на гэты конт, і гэта робіць іх свабоднымі. Бо яны ўвогуле па-за забабонаў. Як кажуць: «Хай гавораць...» (быў, здаецца, нават такі фільм).

Яны прымаюць адзін аднаго і іншых людзей такімі, якія яны ёсць на самай справе. Не перарабляюць кожнага пад сябе і свае густы. Відаць, і самі чакаюць такога стаўлення да сябе. Ім зручна з тымі, хто не робіць ім пустых заўваг: маўляў, ты не такі, як усе; будзь, як усе.

У любой сітуацыі можна адначасова застацца свабодным, добрым і сумленным чалавекам, жыццё ж нам даецца толькі адзін раз, дык давайце ж як нарадзіліся свабоднымі, так і застанёмся такімі ж.

## НЕ ПАРУШАЦЬ СВАБОДУ ІНШАГА

**Андрэй Папоў**
**г. Мінск**

Для мяне свабода — гэта свабода слова, свабода друку, свабода дзеянняў, свабода думкі. На мой погляд, так і павінна быць! Чалавек на-

роджаны свабодным, і гэта вельмі цудоўна. Чалавек думае аб чым хоча, робіць што хоча. Чым гэта дрэнна?! Яму хараша! Гледзячы чаго ён хоча! Людзі бываюць розныя, і жаданні ў іх розныя. Жадаючы сваёй свабоды, галоўнае не парушыць свабоду іншага. Свабоду кожнага з нас абмяжоўвае сумленне і дзяржава. Калі б гэтых межаў не было, то на зямлі былі б хаос і анархія. Дзяржава гэтага не дазваляе. Некаторыя людзі сваімі дзеяннямі парушаюць свабоду іншых і ідуць на злачынства. Выказваючы сваю свабоду слова, можна гэтай свабодай закрануць свабоду іншага. Але пра гэта мы не часта задумваемся. Мы лічым, што робім правільна, а на самай справе не!

Кожны раз, калі хачу што-небудзь зрабіць, я задумваюся аб тым, ці трэба гэта рабіць. Бывае, скажаш што-небудзь на чалавека, а ён пакрыўдзіцца. Здаецца, што тут дрэннага?! Я ж выказаў сваю думку, але парушыў свабоду іншага чалавека. Так не павінна быць! На мой погляд, свабода аднаго заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода іншага.

## ВЕЦЕР СВАБОДЫ

**Вікторыя Рэвенька**
**г. Брэст**

*Сапраўдная свабода не можа быць*
*падараваная, яе трэба дасягнуць.*
Франклін Д. Рузвельт

Пытанне свабоды — адна з самых цяжкіх і складаных праблем, якія паўстаюць перад чалавекам. Свабода — гэта такія паводзіны чалавека, якія залежаць ад яго асабістых дзеянняў, свядомасці, волі.

Формай праяўлення свабоды выступае выбар, які робіць чалавек. Свабода не з’яўляецца чымсьці безумоўна і неад’емна дадзеным чалавеку. Гэта праграма яго самаразвіцця. Свабодны чалавек асэнсавана прымае рашэнні, прадугледжвае вынікі сваіх паводзін.

Быць свабодным — значыць заваяваць свабоду. Але ж нельга сказаць, што свабода існуе сама па сабе, мы яе, хутчэй, дамагаемся. У гэтым сэнсе свабода ёсць праяўленне чалавечай годнасці, самой прыроды чалавека, таго, на што ён варты, пераадольваючы перашкоды і абмежаванні.

Быць свабодным намнога цяжэй, чым адмовіцца ад свабоды: свабода патрабуе ўвесь час ісці супраць плыні, паўставаць супраць агульнапрынятых нормаў, быць «чужым сярод сваіх». Не кожнаму па плячы гэта «цяжкая ноша свабоды», якую павінен несці чалавек. Толькі асобныя індывіды, нягледзячы на погляды большасці і супраціўленне афіцыйных структур, рэалізуюць свае права на свабоду.

<...>

Наша краіна на працягу доўгага часу была пазбаўлена свабоды. Беларускі народ змагаўся за сваю незалежнасць, не страчваў надзеі. Беларусы цвёрда накіраваліся да пастаўленай мэты. Мабыць, менавіта гэта і прывяло іх да сапраўднай свабоды.

Мне вельмі хацелася б, каб мой родны народ не страціў доўгачаканай свабоды, якую здабыў шляхам цяжкай крывавай барацьбы.

Я лічу, што свабоднай мае права называцца тая нацыя, якая з павагай адносіцца да сваёй краіны, любіць зямлю сваіх прадзедаў, шануе нацыянальныя традыцыі і размаўляе на роднай мове.

Наша грамадства па-рознаму ставіцца да свабоды. Існуе некалькі поглядаў на яе. Некаторыя людзі лічаць, што свабодай патрэбна толькі валодаць, карыстацца ёю для дасягнення сваіх жаданняў. Але яны не задумваюцца над тым, што, хаця свабода і з'яўляецца галоўнай маральнай і фізічнай каштоўнасцю, якая дадзеная кожнай жывой істоце ад нараджэння, у кожны момант можна страціць яе. Дасягнуць свабоды вельмі цяжка, а страціць — справа адной хвіліны. Іншыя лічаць, наадварот, што свабода не дадзена чалавеку першапачаткова, што яе трэба паступова заваёўваць. Свабода не можа быць падаравана людзям звонку. Яны могуць здабыць і адстаяць яе толькі самі, у барацьбе, рэалізуючы сябе як асобы. І чым з большымі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца ў барацьбе за свабоду, тым больш выразна ўсведамляецца яе каштоўнасць.

Яскравым прыкладам гэтай думкі з'яўляецца лёс Яўгеніі Сяргееўны Якуты, якая прысвяціла сваё жыццё служэнню Радзіме. Яна працавала ў нелегальнай разведцы. Разумее свабоду Яўгенія Сяргееўна зусім па-іншаму, у адрозненне ад звычайных людзей.

Яўгенія Якута нарадзілася ў Беларусі ў 1945 годзе. Жыла ў мястэчку Лінова Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў. На працягу некалькіх гадоў выязджала ў замежныя камандзіроўкі, працавала ў агенцтве друку «Навіны» (АДН). Аўтар шэрага раманаў, аповесцяў і апавяданняў. Публікавалася ў айчынным і замежным друку. У апавяданні «Мата Хары і сантэхнік» яна дакладна і вельмі яскрава паказала жыццё людзей, якія працавалі ў нелегальнай разведцы.

Амаль тое ж, але ў больш жорсткім выглядзе, было і з яе жыццём. На першы погляд, як могуць падумаць звычайныя людзі, яна была пазбаўлена ўсялякай свабоды. Яна не магла сама выбраць сабе мужа, не магла ні з кім пазнаёміцца. Калі ж у яе адбывалася знаёмства, яна павінна была даць кіраўніцтву дакладныя звесткі пра гэтага чалавека. Калі Яўгенія выязджала ў замежныя краіны, пастаянна змяняўся яе пашпарт. Прыязджала за мяжу з адным пашпартам, а выязджала з іншым. Гэта рабілі дзеля таго, каб не было зафіксавана яе знаходжанне ў пэўнай краіне. Вяртаючыся з камандзіровак (так называлі ў той час сакрэтныя заданні), яна не магла карыстацца тымі рэчамі, якія былі прывезены з-за мяжы, каб не звяртаць на сябе ўвагу навакольных. Таксама ёй забаранялася чытаць кнігі на замежных мовах, каб гэта не

кідалася ў вочы простым людзям. Яўгенія Сяргееўна раней нікому не мела права расказваць пра сваю працу, пра разведку, бо гэта катэгарычна забаранялася. Яна баялася пануючай улады. Зараз гэта мужная жанчына з гонарам расказвае пра ўсё, што адбывалася ў той час. Яўгенія Сяргееўна гаворыць, што яе зараз мала хто ведае (вельмі многіх, хто з ёю працаваў, пасадзілі ў турму або саслалі за мяжу), былой улады няма, таму яна можа свабодна гаварыць пра сваё жыццё і пра свой лёс. Яна ніколі не лічыла сябе пазбаўленай свабоды. Для яе свабода — гэта служэнне Радзіме, роднаму народу.

Менавіта людзі, падобныя да Якуты, могуць быць па-сапраўднаму свабоднымі і зрабіць свабоднай сваю краіну. Яны ахвяруюць сабой дзеля роднай зямлі, рызыкуюць сваім жыццём, для іх гэта і ёсць сапраўдная свабода.

У нашым грамадстве свабода амаль зусім не шануецца. Гэта звязана з тым, што сучасная моладзь, якая карыстаецца шматлікімі правамі, не разумее, што ўсё гэта ўмоўна, што свабоду ў любы момант можна страціць. Людзі павінны зразумець, што «свабода — гэта не значыць рабіць як хочаш, свабода — гэта значыць рабіць правільна» (Папа Ян Павел II).

Для мяне асабіста няма рэчаў, важнейшых за свабоду. Я лічу, што «чалавекам з вялікай літары» можа называцца толькі той чалавек, які валодае свабодай. Я магу шчыра адказаць сабе: я — за свабоду. Свабоду любіць сваю Радзіму, свой народ, сваю родную мову.

Мне вельмі хочацца, каб мая родная Беларусь заставалася заўсёды свабоднай, але не фармальна, а па-сапраўднаму. Калі мая Радзіма будзе свабоднай, то і я заўсёды буду адчуваць подых свабоды.

Вецер свабоды прыносіць перамены… Рухацца ў будучыню наша нацыя павінна на «крылах свабоды».

Імкненне да свабоды можа пераадолець усе перашкоды, якія стаяць на шляху да незалежнасці. Людзі не павінны забываць пра гэта, і яны будуць па-сапраўднаму свабоднымі заўсёды.

Няхай жыве і квітнее свабодная Беларусь! Няхай заўжды будзе свабодным і незалежным беларускі народ!

## СВАБОДА — ДОЛЯ МОЦНЫХ

**Дар'я Русецкая**
**г. Мінск**

*Добра быць у дарозе,*
*якую ты сам выбіраеш.*
Якуб Колас

Кожны чалавек па-свойму разумее свабоду. Некаторыя мяркуюць, што яна дае магчымасць рабіць тое, што хочацца, але менавіта для мяне сва-

бода — гэта асабісты выбар свайго жыццёвага шляху, незалежнасць погляdaў. Свабода — гэта самая вялікая каштоўнасць, за якую людзі змагаліся на працягу доўгіх вякоў.

Нельга сказаць, што сучасныя людзі свабодныя. У свеце, дзе вырабляюцца тысячы аднолькавых рэчаў, немагчыма быць поўнасцю вольным у сваім выбары. Вялікую ролю ў абмежаванні чалавечай свабоды адыгрывае тое, што людзі залежаць адзін ад аднаго, бо заўжды важна, што скажуць пра тваю новую сукенку, як паглядзяць, ці спадабаецца яна іншым.

Некалькі гадоў таму, пад страхой вясковага дома, я знайшла старыя газеты. Над пажоўклымі лістамі я прасядзела ўсю ноч, некаторыя артыкулы яшчэ захаваліся ў мяне. У адным з іх расказваецца пра пажарнага, які ратаваў цэлую сям'ю, а сам загінуў. Малады чалавек разумеў, якую складаную прафесію ён абраў, але зрабіў свой выбар, выбар моцнага воляй. Пажарны застаўся верным сваёй справе, а значыць, ён быў свабодным да канца.

Быць свабоднымі — гэта доля моцных духам і смелых людзей. Не кожны здолее выказаць тое, пра што думае, не кожнаму пад сілу супрацьстаяць натоўпу. Я захапляюся людзьмі, якія не чакаюць падарункаў ад лёсу, а самі рухаюцца насустрач, часам насуперак яму. Мне здаецца, што жыццё любіць такіх людзей, таму ў канцы дарогі яны атрымаюць тое, аб чым марылі і да чаго ўпарта ішлі.

## СВАБОДА ДЛЯ МЯНЕ

**Уладзімір Смыслоў**
**г. Мінск**

*Свабода асобы неадрыўна звязана*
*са свабодаю грамадства.*
Дэйл Карнэгі

З даўняга часу свабода разумелася па-рознаму, напрыклад: свабода ад рабства, свабода ад заключэння ў астрог, свабода ў правах… Слова «свабода» прысутнічае ў шматлікіх палітычных лозунгах. «Свабода, роўнасць, брацтва», напрыклад. А што такое свабода для мяне?

Гледзячы ў якой сітуацыі. У апошні дзень вучобы ў школе я расчыніў дзверы нашай навучальнай установы з глыбокім уздыхам свабоды, на якую я выйшаў пасля доўгіх гадоў навучання. Калі я здаваў іспыты, то, атрымаўшы здавальняючую адзнаку, я таксама адчуваў свабоду ад хвалявання за вынікі сваёй працы. Свабоду я адчуваю кожны раз, калі вырашылася якая-небудзь хвалюючая мяне праблема. Свабодны я, калі катаюся на сваім жалезным сябры — старым ровары, які ратаваў мяне ад самоты ў хаце. Вядома ж, свабоду я адчуваю, калі не парушаюць мае правы. Я вельмі не люблю, калі мне нешта

забараняюць, але я маю поўнае права гэтым карыстацца ці прымаць удзел у нейкай справе, а тут раз — і забаранілі. Добра, калі я заслужыў пакаранне, а калі гэта незаслужана? Гэта вельмі дрэнна.

Мець сяброў — гэта таксама свабода. Жыццё без сяброў — гэта не жыццё. Свабода ў адносінах, свабода ў эмоцыях.

Свабода, што гэта? Я не лічу, што гэта дар Божы. Свабоду робіць сам чалавек і сам ёю карыстаецца. Галоўнае — каб яна не перастала існаваць.

## ДУМАЮ ПРА СВАБОДУ

**Аляксандр Стрэмінскі**
**г. Мінск**

Да гэтага моманту я не задумваўся аб тым, што такое свабода. Мне здаецца, што зразумець гэта можна толькі тады, калі яе не маеш. Асабліва разумеюць свабоду тыя людзі, якія пабылі ў месцах пазбаўлення волі.

Свабода ў грамадстве вызначаецца свабодай слова, калі я магу выказвацца па той ці іншай праблеме ў часопісах і газетах, незалежна ад адносін дзяржавы да гэтай тэмы. Не заўсёды мае думкі павінны супадаць з дзяржаўнымі, кожны чалавек мае права разважаць па-свойму. Маю права выказваць думкі, якія не пярэчаць законам маёй дзяржавы. Таксама я маю права на свабоду перамяшчэння, маю права на выбар любой краіны, дзе хацеў бы адпачыць альбо жыць. Некаторыя дзяржавы забараняюць права на ўезд грамадзянам некалькіх дзяржаў, тым самым парушаючы іх правы. Таксама я маю свабоду выбару. Выбар мой велізарны: ад права на выбар прэзідэнта да выбару тавараў першай неабходнасці. Гэта мой асабісты выбар, і я раблю яго сам.

На гэты момант мы жывём у XXI стагоддзі, а наша свабода парушаецца, як і ў сярэднявеччы. Працягваюцца войны, парушаюцца ўсе магчымыя правы і свабоды. Самым распаўсюджаным парушэннем з’яўляецца рабства. Яно распаўсюджваецца сярод маладых жанчын, якіх бяруць у рабства для прастытуцыі, і гэтым парушаецца іх свабода. Яны маюць права на выбар, чым ім займацца і як жыць. Таксама вывозяць людзей за мяжу, прадаюць іх, як быццам гэта нейкая жывёла.

І вось у канцы я хачу даць сваё разуменне свабоды: свабода — гэта калі я магу рабіць усё, што хачу, і гэтыя дзеянні не выходзяць за рамкі ўсёдазволенасці.

# СВАБОДА — ГЭТА АДКАЗНАСЦЬ

**А. Шастун**
**Любанскі раён, в. Дарасіно**

Імкненне да свабоды — адно з самых моцных чалавечых пачуццяў.

Са свабодай людзі звязваюць ажыццяўленне сваіх жаданняў і планаў, магчымасць па ўласнай волі выбіраць жыццёвыя мэты і шляхі іх дасягнення. Само слова «воля» ўжо прадугледжвае здольнасць чалавека рабіць гэты выбар і ажыццяўляць яго. Для ўсіх нас свабода — самая дарагая агульначалавечая каштоўнасць.

Абсалютнай свабоды няма і быць не можа, таму што чалавек жыве сярод людзей. А жыць у грамадстве і быць свабодным ад яго немагчыма. Калі б кожны мог рабіць тое, што яму ўзбрыдзе ў галаву, грамадства ператварылася б у вар'яцкі дом, і чалавеку страшна было б выйсці на вуліцу. Аснова свабоды для чалавека — гэта гармонія грамадскіх і асабістых інтарэсаў. Напрыклад, калі наша грамадства зацікаўлена ў тым, каб я, навучэнец каледжа, вучыўся добра, стаў добрым спецыялістам, значыць, я свабодны выбіраць сотні шляхоў для таго, каб вучыцца як мага лепш. Не маю свабоды я толькі на тое, каб увільваць ад вучобы, гультайнічаць.

Асабліва шкодная думка аб абсалютнай свабодзе ў сферы інтымных, маральна-этычных адносінаў — у каханні, у шлюбе, у сямейным жыцці. У гэтых сферах чалавечага жыцця свабода з'яўляецца перш за ўсе найвялікшай адказнасцю.

Жыццё чалавека нельга раздзяліць перагародкай: па адзін бок — тое, што чалавек можа рабіць, аглядаючыся на грамадства, па другі — тое, што ён вольны рабіць, абсалютна не думаючы аб людзях. У нашым грамадстве шмат такіх людзей. Яны, знаходзячыся на працы, могуць выглядаць добрапрыстойнымі, чысценькімі, а дома — міраедамі, тыранамі, катамі блізкіх.

Свабода для мяне — гэта ніколі не баяцца выказаць тое, што я адчуваю, нават калі думкі супярэчаць агульнапрынятым.

І яшчэ вельмі важна адчуваць тры рэчы: можна, нельга і трэба. Той, хто адчувае гэтыя рэчы, валодае пачуццём абавязку. Абавязак — гэта свабода ў дзеянні, гэта натхненне людскіх учынкаў высакароднай ідэяй: дзеля чаго я гэта раблю, дзеля чаго так раблю.

Ва ўсіх сферах чалавечага жыцця свабода з'яўляецца перш за ўсё найвялікшай адказнасцю.

# СВАБОДА ПАВІННА БЫЦЬ АБМЕЖАВАНАЙ

**А. Шчаглоўскі**
**г. Мінск**

Гісторыя сведчыць, што людзі заўсёды імкнуліся да свабоды і, калі не валодалі ёю, мужна змагаліся за яе. Для свабоды людзі заўсёды здзяйснялі подзвігі.

Напрыклад, у 1239 г. пад Крутагор'ем дружына наваградскага князя Міндоўга разбіла полчышча татарскага хана Кайдана. Перамога паставіла заслон перад ардою, і беларускія землі не зведалі татарскай няволі. У XIII–XIV стагоддзях беларусы неаднаразова адбівалі атакі нямецкіх рыцараў. Як вынік — у 1410 годзе беларускія палкі разам з войскамі суседніх дзяржаў нанеслі гэтым рыцарам сакрушальны ўдар пад Грунвальдам. Можна ўзгадаць яшчэ шмат прыкладаў змагання нашага народа за свабоду, за волю.

Сёння, калі мы наогул маем свабоду, калі мы незалежная краіна, нас прызнаюць амаль ва ўсім свеце, мы думаем зусім аб іншай свабодзе, аб свабодзе асобы. Я выступаю перш за ўсё за свабоду слова. Мне здаецца, што ў незалежнай дэмакратычнай краіне кожны чалавек мае права выказваць свае думкі, нават калі яны разыходзяцца з меркаваннямі многіх аўтарытэтных людзей. Але я не выступаю за абсалютную свабоду, бо, валодаючы ёю, людзі могуць ператварыцца ў жывёл. Калі народ не абмяжоўваць у імкненнях і жаданнях, то ён можа ператварыць свет у хаос. Людзі не будуць слухаць адзін аднаго, рабіць толькі тое, што яны жадаюць, не заўважаючы патрэб і жаданняў іншых. Так, свабода павінна быць абмежаванай. Гэта значыць, павінны існаваць нейкія рамкі, за якія людзі не павінны выходзіць. Напрыклад, калі чалавек будзе валодаць абсалютнай свабодай, ён можа рабіць усё, што захоча. Хочаш забіць — забівай, хочаш красці — крадзі, бо табе ўсё дазволена. Але калі чалавек ведае, што забіваць і красці нельга, за гэта ён будзе адказваць перад судом, то ён шмат разоў падумае, перш чым гэты ўчынак зрабіць. Такім чынам, я сцвярджаю, што чалавек мае права і павінен быць свабодным, але свабода гэта абавязкова павінна быць абмежаванай. Вось толькі такім шляхам людзі могуць стаць шчаслівымі.

## МАЁ РАЗУМЕННЕ СВАБОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

**Аляксандр Юркавец**
**г. Мінск**

Свабода — адна з асноўных філасофскіх катэгорый. Яна характарызуе сутнасць чалавека і яго існавання, якое складаецца з магчымасці асобы мысліць і дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі і жаданнямі, а не праз унутраны і знешні прымус.

Канстытуцыя — асноўны закон, які дэкларуе правы і абавязкі чалавека. Кожны чалавек мае права на жыццё і працу. Свабода — гэта наяўнасць правоў, якія прадастаўляе дэмакратычная дзяржава чалавеку.

<...>

Я лічу, што грамадзянскія правы не звязаны з прыналежнасцю да канкрэтнай дзяржавы. На маю думку, грамадзянін атрымлівае магчымасць ажыццяўляць кантроль за дзяржавай і нават процістаяць ёй, калі гэта неабходна. Дзеля гэтага сваё развіццё атрымліваюць недзяржаўныя аб'яднанні і арганізацыі. Выказваючы праз іх свае інтарэсы, чалавек атрымлівае ў свае рукі рычагі кантролю за дзяржавай.

Робячы выснову з усяго пералічанага, хочацца сказаць, што свабода — гэта і ёсць здольнасць грамадзяніна дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі інтарэсамі і мэтамі, ажыццяўляць выбар стратэгій сацыяльных паводзін і зносін. Права на асабістую свабоду выступае натуральным правам, якім надзелены чалавек з моманту яго нараджэння.

## АБСАЛЮТНА СВАБОДНЫХ ЛЮДЗЕЙ НЯМА

**Кацярына Юркова**
**г. Мінск**

Для мяне свабода — гэта магчымасць праяўляць сваю волю, гэта незалежнасць. Сучасны чалавек дастаткова свабодны, у яго ёсць свабода выбару: ён можа апранацца, як яму хочацца, сябраваць або не сябраваць, выбіраць тую рэлігію, якая яму бліжэй, і г. д. Але я добра разумею, што абсалютна свабодных людзей няма. Усе мы жывём у грамадстве і ўзаемадзейнічаем з ім. Мы не можам не звяртаць увагі на інтарэсы і свабоду іншага чалавека. Быць незалежным, валодаць свабодай дзеянняў імкнуцца ўсе. Мудра заўважыў Якуб Колас: «Добра быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш». Але для чаго патрэбна свабода дзеянняў? Па-першае, для таго, каб дасягаць жыццёвых мэт і дабівацца ажыццяўлення сваіх ідэалаў. Па-другое, свабода

дзеянняў патрэбна для рэалізацыі ўсіх здольнасцяў асобы, узбагачэння духоўнага свету чалавека, праяўлення яго творчых магчымасцяў, увогуле фарміравання чалавека як асобы.

У кожнай дзяржаве існуюць свае законы. I свабодны ў сваіх дзеяннях той, хто ўмее карыстацца сваімі канстытуцыйнымі правамі і паважаць правы іншых людзей. У адносінах паміж чалавекам і дзяржавай чалавеку дазволена ўсё, што не забаронена законам. Але існуе мараль, так званыя «няпісаныя законы», якіх таксама трэба прытрымлівацца і ніколі пра іх не забываць. Рэалізуючы сваю свабоду, нельга кіравацца толькі ўласнымі інстынктамі, не трэба пераступаць праз сумленне, трэба заўсёды памятаць пра навакольных людзях.

На мой погляд, большую свабоду маюць багатыя людзі. Ёсць такое выказванне, што грошы вырашаюць ўсё. Я з гэтым не згодна, бо ёсць такія каштоўнасці, якія ніколі не купіш за грошы: здароўе, сям’я, каханне, дружба... Але ўсё ж такі багаты чалавек мае больш свабоды, чым астатнія. Ён эканамічна незалежны чалавек. Напрыклад, я зараз залежу ад сваіх бацькоў, што вельмі абмяжоўвае маю свабоду.

Такім чынам я магу зрабіць выснову, што абсалютна свабодных людзей няма. I мы павінны выразна разумець, што наша свабода заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода іншага чалавека.



# Нам свабоды хапае

## СУЧАСНЫ ПОГЛЯД НА СВАБОДУ

**Аляксандр Радзівановіч**
**г. Мінск**

Свабода — чароўнае слова. Аб ёй гаварылі філосафы Старажытнага Рыма, мудрацы Кітая, пісьменнікі эпохі Адраджэння ў Еўропе. А я прапаную абмеркаваць сучасны погляд на свабоду.

Калі пацікавіцца ў сучаснага чалавека, што такое свабода, атрымаеш шмат адказаў. Адны кажуць, што быць свабодным — гэта магчымасць рабіць усё, што ты пажадаеш. Іншыя кажуць, што свабода — гэта магчымасць выбіраць свой шлях, які адрозніваецца ад іншых. А нехта кажа, што ў нашым грамадстве няма ніякай свабоды.

Але я лічу зусім інакш. Я разумею так. Свабода існуе, але двух тыпаў: свабода пазітыўная і свабода негатыўная. Свабода пазітыўная — гэта магчымасць жыць у грамадстве з іншымі людзьмі, выбіраць, як і з кім ты будзеш узаемадзейнічаць, дзе і як ты будзеш працаваць. А свабода негатыўная — гэта страшэнная з’ява, калі чалавек робіць усе, што пажадае. Такая ўсёдазволенасць знішчае чалавека: ён не мае ніякіх рамак, ён можа пачаць абражаць іншых, красці, забіваць. І нічога яго не стрымлівае: такая істота небяспечная для грамадства, звычайна такога можа спыніць толькі невялікі кавалачак свінцу.

Але вернемся да нашага грамадства. Многія лічаць, што мы не маем свабоды ў Беларусі. Я лічу, што гэта не так. Толькі наша свабода вельмі жорстка абмежаваная. Грамадства мае магчымасць выбіраць — мы маем пазітыўную свабоду. Але амаль немагчыма паўплываць на палітыку дзяржавы: цябе затрымаюць. Я лічу, што гэта з’явілася пасля 90-х гадоў, калі не было моцнай цэнтралізаванай улады і было шмат людзей, якія хацелі зарабіць грошы на тым, што абрабоўвалі сваю Радзіму. У той час былі патрэбны жорсткія меры, каб не разбурыць эканоміку Беларусі. Многія могуць лічыць, што я

нічога не разумею, але я прапаную паглядзець на краіны былога СССР і цікавіцца становішчам простага народа ў іх. А пасля гэтага я паслухаю вашы адказы і доказы, што я не маю рацыі.

Ад будучыні я чакаю, што жорсткі кантроль дзяржавы за грамадствам паслабее: палітыкі зразумеюць, што цяжкая эпоха крызісу прайшла, Беларусь стала прыгожай і квітнеючай краінай, якую паважаюць за мяжой і прызнаюць у свеце. Беларускі народ сам зразумее, што яму трэба рабіць і як жыць далей. Нягледзячы на сённяшняе нялёгкае становішча, я з надзеяй гляджу ў будучыню нашай краіны і лічу, што мае дзеці будуць жыць у больш багатай і больш прыгожай Беларусі.

## МАЁ РАЗУМЕННЕ СВАБОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

**Яўген Шапавал**
**г. Мінск**

Імкненне да свабоды — адно з самых моцных пачуццяў чалавека. Палымяны змагар з самадзяржаўем і прыгонным правам Н. Агароў казаў: «Усё жыццё мне зноў і зноў гучала адно нязменнае слова: Свабода! Свабода!»

Для ўсіх нас свабода — самая дарагая каштоўнасць. Якуб Колас пісаў, што свабода — вышэйшае людское імкненне: «Зямлі і хлеба... Сонца і свету... Жыцця і волі...». На працягу доўгіх вякоў права на волю і жыццё, свабоду і роўнасць, зямлю і хлеб дадзена толькі частцы насельніцтва. За свабоду заўсёды змагаліся. Да барацьбы за свабоду і незалежнасць заклікалі беларускія барацьбіты, пісьменнікі.

Яшчэ з пачатковых класаў я быў знаёмы з такімі словамі, як свабода і права.

Цяжкім было жыццё нашых продкаў. З гутарак са сваім дзедам я даведаўся, якім было іх жыццё. Яны не мелі права хадзіць у лес па ягады ці грыбы, лавіць рыбу, іх маглі прадаць ці купіць. У продкаў не было зямлі, працавалі па 14–16 гадзін, вучыцца маглі толькі дзеці багатых. Але мара народа стаць свабодным збылася.

Мы жывём у свабоднай краіне. Мы маем правы, якія не павінны парушацца, але разам з тым у нас ёсць і абавязкі. Я скончыў дзевяць класаў і рашыў пайсці вучыцца ў каледж. Мне хочацца працаваць на буйнейшым прадпрыемстве нашага горада — трактарным заводзе. І ніхто мне не забароніць гэтага, ніхто не парушае мае правы. У гэтым выбары я свабодны. «Хораша быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш», — мудра заўважыў Якуб Колас. І гэтыя словы я стараюся памятаць. Свабоду я адчуваю ва ўсім сваім жыцці і ў жыцці сяброў, родных, суседзяў. Мы свабодна перамяшчаемся па горадзе, бываем у тэатрах, на стадыёнах.

Свабода, здаецца, даступна кожнаму, але ці па сіле яна любому з нас? Свабода — складаная з’ява. Быць свабодным — гэта не значыць дзейнічаць па прынцыпе «ўсё дазволена». Такая пазіцыя — пазіцыя цынізму, эгаізму і разбурэння, гэта дзеянне амаральнае, злачыннае. Асоба свабодная, калі свабоднае грамадства. А свабоднае грамадства — гэта грамадства, дзе людзі самі ўпраўляюць сацыяльнымі працэсамі ў суадносінах з патрабаваннямі разумення законаў.

Я лічу, што жыву ў свабоднай краіне. У нас існуе выбарчая сістэма. Нядаўна ў краіне прайшлі выбары прэзідэнта. Выбары былі свабодныя, кожны чалавек зрабіў свой выбар. Але тое, што было на плошчы, гэта парушэнне нормаў свабоды іншых людзей. Сорамна было глядзець на тое, што рабілася каля святога месца горада, куды прыходзяць людзі пакланіцца памяці загінуўшых. Гэта было глумленне з нашага мінулага і будучага. А мінулае нельга аддзяляць.

Не так зразумелі слова «свабода» тыя, што былі на плошчы 19, 20, 21 сакавіка 2006 года.

Я разумею, што свабода — гэта свабода праяўлення сіл чалавека, дзе ўзвышаецца асоба, дзе рэалізуюцца здольнасці, узбагачаецца духоўны свет чалавека, культура.

## ШТО ТАКОЕ СВАБОДА?

**А. Шашок**
**г. Мінск**

Свабода — гэта стан чалавека, калі ён можа дзейнічаць у адпаведнасці з уласнай воляй. Вучоныя падзяляюць свабоду на негатыўную і пазітыўную. У грамадстве 100-працэнтнай свабоды няма. Яна чымсьці абмяжоўваецца, але ў кожнай дэмакратычнай краіне ёсць свабода ў грамадстве. Напрыклад: свабода слова, свабода веравызнання і г. д. Але свабоду можна і згубіць, напрыклад, калі ты зрабіў злачынства, то цябе за гэта могуць пасадзіць у астрог, дзе ты страціш свабоду. Але там будуць выконваць твае правы.

Кожны па-свойму разумее свабоду. Для мяне гэта ўсе, што я хачу, але калі не шкодзіць іншым людзям.

Свабода — гэта не ўсёдазволенасць, чалавечы рух абмежаваны сацыяльнымі абумоўленасцямі. Гэта значыць — не можаш рабіць усяго, што захочаш.

Для мяне свабода — калі я магу рабіць усё, але на карысць грамадству і дзяржаве. Давайце паглядзім, якая ёсць свабода ў грамадстве. Вось нядаўна адбыліся выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Выйграў іх А. Р. Лукашэнка, але апазіцыя гэтым не была задаволена, яна патрабавала перагляду вынікаў, але выбары прайшлі па законе. Апазіцыя заклікала людзей ісці

на мітынгі, яны хацелі ўзяць кіраўніцтва краінай, як узялі на Украіне, у Грузіі, Малдове і г. д. Яны заклікалі маладых на Кастрычніцкую плошчу ў так званы «гарадок» жыць і змагацца за свабоду. Але як яны гэта рабілі? Давалі грошы, каб ты там пастаяў, давалі гарэлку, наркотыкі, а потым заклікалі ісці на мітынг, каб усё біць і крушыць. І за такую свабоду нам трэба змагацца — каб усю краіну распрадалі ЗША і Еўропе! Не, я не за такую свабоду ў грамадстве! У нашай краіне свабода абмяжоўваецца, але гэта ёсць і ў самай дэмакратычнай краіне свету — у ЗША. Для мяне свабода — гэта мой дом, мая краіна, усё роднае, вучоба, гульня з сябрамі ў футбол і г. д. Але паглядзіце: у нас няма такой беднасці і злачыннасці, як у Расіі ці Польшчы, і таму мой выбар — «За Беларусь!»

## МАЁ РАЗУМЕННЕ СВАБОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

**В. Швайкоўская**
**г. Мінск**

Свабода… Як шмат гэта слова значыць для кожнага чалавека. З далёкіх часоў людзі змагаліся за яе, аддавалі свае жыцці. Гэта былі вельмі цяжкія часы. Часы, калі людзі не мелі і часткі таго, што зараз мае кожны з нас. Не было крам, а адукацыю маглі атрымаць толькі багатыя людзі. У простых людзей і свабоды не было. Заўсёды яны ад каго-небудзь залежалі. Памешчыкі здзекаваліся з простых сялян. Канешне, людзі былі не задаволены такім становішчам. Таму адбываліся паўстанні. Людзі, якія жылі ў тыя часы, лічылі, што свабоду і волю можна атрымаць толькі ўзброеным шляхам. Самае вялікае паўстанне на тэрыторыі Беларусі і Літвы адбылося ў 1863 годзе пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Ішоў час, але свабоды людзі не атрымалі. Шмат пісьменнікаў у сваіх творах заклікалі людзей да барацьбы. Якуб Колас пісаў: «Зямлі і хлеба… Сонца і свету… Жыцця і волі…»

Праз некаторы час людзі амаль атрымалі свабоду. Яны маглі працаваць на тым месцы, дзе ім хацелася, маглі купляць патрэбныя сабе рэчы. Але не было галоўнага — свабоды слова. Гэта былі часы, калі пры ўладзе быў Сталін. Сусед мог данесці на суседа, сябар на сябра, калі той скажа што-небудзь супраць улады. Не было свабоды друку. Газеты пісалі тое, што ім скажуць. Людзі змагаліся і супраць гэтага. Яны падпольна пісалі лістоўкі, у якіх заклікалі людзей да барацьбы. Ці можна сказаць, што людзі ў тыя часы былі свабоднымі? Я лічу, што не.

Зараз мы жывём ва унітарнай, дэмакратычнай і прававой дзяржаве, дзе існуе поўная свабода слова. Людзям дазволена рабіць усё, што не забараняецца законам. Мы свабодныя людзі. А ці на самай справе гэта так?

19 сакавіка праходзілі выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Кожны грамадзянін, які дасягнуў васемнаццаці гадоў, мог прыйсці і прагаласаваць за таго ці іншага кандыдата. Па выніках выбараў перамогу атрымаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Ён абраны ўжо на трэці тэрмін. Шмат замежных палітыкаў з такім выбарам беларускага народа не вельмі згадзіліся. Яны хацелі правесці розныя рэвалюцыі. Але гэта наш выбар. Мы жывём у гэтай краіне, і нам вырашаць, каму тут правіць. Але некаторыя з кандыдатаў вырашылі парушыць спакой беларусаў. Яны казалі, што вельмі любяць Беларусь, што пры іх уладзе ўсё будзе вельмі добра, што яны патрыёты сваёй Радзімы. Але самі яны жывуць за межамі нашай краіны, а грошы на так званую «Джынсавую рэвалюцыю» давалі замежныя палітыкі. Які тут патрыятызм? Некалькі сотняў людзей атрымалася сабраць апазіцыянерам на Кастрычніцкай плошчы горада Мінска. Але гэта былі не вельмі сур'ёзныя людзі. Сваю Радзіму яны гатовы прадаць за дармавую бутэльку піва ці яшчэ чаго-небудзь. Я лічу, што такія людзі і забруджваюць наша грамадства. У іх і лозунг быў смешны: «За свабоду!». Цікава, а што ў іх разуменні ёсць свабода? Зараз, едучы ў метро, можна заўважыць у некаторых маладых людзей значок з надпісам: «За свабоду!». Я лічу, што гэтым яны проста жадаюць звярнуць на сябе ўвагу. На шчасце, такіх людзей у нашай краіне меншасць. Большасць людзей лічыць, што лепш, каб пры ўладзе быў правераны чалавек, чым той, ад якога не ведаеш чаго чакаць. Але гэта палітыка, а свабода — гэта не толькі палітыка.

У нашы часы існуе шмат арганізацый, якія адстойваюць правы кожнага грамадзяніна. Калі мы чым-небудзь не задаволены, то гэта мы можам выказаць пры дапамозе мітынгаў, вулічных сходаў. Мы можам свабодна перамяшчацца па краіне, выбіраць сабе месца працы, вучобы. Існуе і шмат свабодных газет, якія пішуць аб тым, што здараецца ў грамадстве. Канешне, сустракаюцца людзі, якія не ўмеюць цаніць свабоду. Але для чалавека гэта самае галоўнае. Чалавек без свабоды, як рыба без вады.

Я ў сваёй краіне адчуваю сябе свабодна. На мой погляд, галоўнае для кожнага чалавека — гэта ўмець цаніць свабоду і мірнае неба над галавой. Я веру, што прыйдзе час, калі ў свеце не будзе войнаў, рэвалюцый. Мабыць, тады ўсе людзі будуць свабоднымі і шчаслівымі. Гэта залежыць толькі ад нас!

# Я ЗА СВАБОДУ!

## Я РАЗУМЕЮ ГЭТА ТАК

**Ягор Пузына**
**г. Мінск**

Што такое свабода для кожнага чалавека, які жыве на нашай планеце? Што ён разумее пад гэтым словам?

Я, напрыклад, разумею гэта так: я магу мець сваю думку, якая нікім мне не навязана, і магу вольна яе выказаць. Маю права выбіраць, прымаць рашэнні і несці адказнасць за іх.

Пакаленне, якое жыло пры савецкай уладзе, было пазбаўлена свабоды, і таму, на мой погляд, пасля развалу СССР беларусы не змаглі распарадзіцца сваёй свабодай. Людзі ўсё жыццё жылі па загадзе. Спачатку ў школе трэба ўступіць у акцябраты, потым у піянеры, а затым ужо ў камсамол — і ніякай альтэрнатывы. Усё па запланаваным сцэнары!

На жаль, такую карціну можна назіраць і сёння. Існуюць «правільныя» дзяржаўныя арганізацыі, такія як БРСМ. Туды прымаюць усіх каму пажадаецца, не гледзячы, хто ты і як вучышся, — усё для таго, каб арганізацыя здавалася вялікай і магутнай. Моладзь заахвочваюць скідкамі на тавары, на ільготнае карыстанне бытавымі паслугамі — і табе нічога не трэба рабіць. Многім падабаецца такая «халява». На гэтым «уступленне» ў БРСМ не заканчваецца. Каб атрымаць пакой у інтэрнаце, майму знаёмаму прыйшлося ўступіць у «шэрагі пярвічнай арганізацыі». А колькі ж іншагародніх прыязджаюць вучыцца ў сталіцу, для якіх інтэрнат становіцца адзінай магчымасцю застацца ў Мінску для вучобы? У час выбараў 2006 г. многіх маіх старэйшых сяброў, якія вучацца ва універсітэтах (яны таксама іншагароднія і жывуць у інтэрнаце), прымушалі ісці на «датэрміновае галасаванне». А тых, хто не згаджаўся з гэтым, чакаў шэраг непрыемнасцяў. Такіх прыкладаў можна прыводзіць мноства, але самае жахлівае тое, што моладзь пагаджаецца з такім

«рабаваннем свабоды», і, на мой погляд, існуе пагроза, што новае пакаленне будзе такім, як і трыццаць гадоў таму.

Няўжо так будзе заўсёды? Няўжо беларусы ніколі не прачнуцца? Няўжо мы будзем заўсёды паслухмянымі малодшымі братамі?

Не! Я ўпэўнены — беларусы прачнуцца! Беларусь стане сапраўднай дэмакратычнай праватой дзяржавай. Калі-небудзь гэта абавязкова здзейсніцца!

## І АНЁЛЫ ПАД НЯБЁСАМІ БУДУЦЬ СПЯВАЦЬ НАШЫ ПЕСНІ…

**Андрэй Людчык**
**г. Мінск**

*Усе людзі нараджаюцца свабоднымі*
*і роўнымі ў сваёй вартасці і правах.*
Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека

Свабода — як шмат у гэтым слове, але, на жаль, не ўсё гэта адчулі на сабе. Колькі людзей шукала да яе дарогі.

Свабодны чалавек — гэта моцная асоба. Ён здольны прыняць на сябе ўвесь цяжар свету, бо лічыць сябе адказным за ўсе непрыемнасці і няшчасці, якія адбываюцца з людзьмі. Гісторыя ведае шмат прыкладаў, калі людзі змагаліся не толькі за сваю свабоду, але і за свабоду іншых. Тыповым прадстаўніком змагара за свабоду быў шатландзец Уільям Уолес. Яшчэ ў маленстве ён бачыў здзекі англійскіх рабаўнікоў з яго родных, з народа, з Радзімы. Калі вырас, ён арганізаваў вызваленчы рух, але загінуў. І такіх, як ён, было шмат.

*Памяркоўнасць пакінем нашчадкам.*
Уільям Уолес

І наша Радзіма таксама не выключэнне. Усе мы ведаем вялікага змагара за вызваленне Кастуся Каліноўскага. Мы бяром прыклад з такіх людзей, памятаем іх і ганарымся імі. Адзін блізкі для мяне чалавек аднойчы сказаў: «Усё жыццё беларусы змагаліся за сваю свабоду, а калі мы яе атрымалі, у нас знікла яе разуменне». Кожны з нас нешта страціў. Сёння мы вельмі часта не зусім разумеем, што значыць свабода. Многія лічаць, што калі яны могуць нешта зрабіць з таго, што раней было забаронена, дык яны свабодныя. Але на самай справе гэта не так. Галоўнае — быць вольнымі ў сваіх сэрцы і душы, незалежнымі ў сваіх думках і марах, калі на нас не ціснуць іншыя. Хоць у наш час гэта вельмі цяжка, бо СМІ, людзі, якія займаюць адказныя пасады, уплы-

ваюць на нашы меркаванні. Але вельмі важна гэтаму не паддацца і выбраць тое, што на самай справе лепшае. Мы жывём у такі час, калі няма рабаўладальніцтва ці прыгонніцтва. Мы ўсе быццам бы свабодныя людзі. А ці адпавядае гэта рэчаіснасці, ці так гэта на самай справе?

У маім уяўленні наша краіна падобная на магутны лес, а яе жыхары — як лёгкія павольныя матылькі. Але ў гэтым лесе гадоў дванаццаць таму пачаўся пажар. Ён пачаў знішчаць усё тое, што будавалася шмат гадоў. І ўсе вольныя матылькі пачалі разлятацца з гэтага месца. Астатнія ўсё лёталі, шукаючы месца, дзе б прысесці, а калі спыняліся, то знішчальнае полымя паглынала іх. І вельмі жахліва, што гэтае полымя абыякавае да іншых, і, пакуль не прыйдзе магутная вадзяная плынь, гэты пажар будзе знішчаць мацней і мацней. Ёсць маленькія маладыя струменьчыкі, якія змагаюцца з ім. Менавіта яны і стануць галоўнай ратавальнаю сілаю гэтага лесу, бо яны жывуць у змаганні і вераць у перамогу.

## МАЁ РАЗУМЕННЕ СВАБОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

**Марына Сіцынская**
**г. Мінск**

Свабода — гэта вялікая і складаная тэма, над якой можна разважаць не адну гадзіну. Я — грамадзянка Рэспублікі Беларусь і лічу, што свабода — гэта галоўная тэма на дадзены момант, бо я ўваходжу ў грамадства як паўнапраўная асоба, адказная перад законам.

<…>

Я лічу, што свабодны грамадзянін — гэта той, які можа рабіць усё, акрамя тых учынкаў, якія накіраваны супраць людзей, краіны, закону. Таксама свабодны чалавек мае поўную і праўдзівую інфармацыю пра падзеі ў сваёй краіне. Ён мае права выбару, мае свае думкі і не баіцца іх выказваць. Але, на жаль, у маёй краіне ўсё інакш.

Я толькі дзяўчынка 17-гадовага ўзросту, але мне не падабаецца тая краіна, дзе я павінна жыць, вучыцца і нараджаць сваіх будучых дзяцей. Бо тут няма ніякай перспектывы для развіцця сваёй прадпрымальніцкай справы. Гэта па-першае. Не, зразумела, кожны мае магчымасць працаваць на дзяржаўным месцы, але матэрыяльныя праблемы будуць паўставаць перад ім зноў і зноў. Гэта па-другое. Што ж тады атрымліваецца ў выніку? А тое, што кожны, хто пажадае адкрыць сваю справу, стане перад выбарам: зрабіцца сумленным бізнесменам і плаціць вар'яцкія падаткі (прыблізна 40%) ці пайсці па злачынным шляху і не плаціць нічога ўвогуле. Што ж, ня лёгкі выбар: падараваць амаль палову сваёй працы грамадству або кожную часіну

думаць, што цябе могуць арыштаваць. Вось такая ў нас свабода дзеяння і перспектыва развіцця бізнесу.

Што датычыцца СМІ, дык мы даведваемся толькі тое, што нам «дазваляе кіраўніцтва». Возьмем, напрыклад, тэлебачанне. Ёсць у нас такая цудоўная праграма «Выбар», якая праходзіць у «прамым эфіры» і дзе абмяркоўваюцца важныя грамадскія пытанні. Але мне выпала прысутнічаць на адной з гэтых праграм. Было вельмі цікава назіраць на здымкі «прамога эфіру» на аўторак, хаця быў усяго толькі панядзелак.

І чамусьці ні ў кога не паўстае пытанне: «А чаму наша тэлебачанне паказвае расійскія праграмы на трое сутак пазней?»

А пра свабоду выбару мне і казаць не трэба, бо гэта паняцце проста адсутнічае. Узяць хаця б мяне, навучэнку МГМК. Калі я паступіла ў наш выдатны каледж, то даведалася, што ў ім ідзе агітацыя за ўступленне ў прафсаюз і БРСМ. Але я не жадала гэтага рабіць, бо такі мой выбар і права. Аднак не прайшло і гадзіны, як мне хуценька растлумачылі, што ёсць толькі дзве дарогі: уступіць у БРСМ або забраць дакументы.

А таксама я дакладна ведаю, што, калі даць прачытаць маё сачыненне бацькам, яны спалохаюцца і папросяць яго перапісаць такім чынам, каб наша грамадства выглядала вельмі добрым, магутным і справядлівым. А ўсё для таго, каб пазбегнуць сур’ёзных праблем.

Вось і атрымліваецца, што сённяшняя беларуская свабода амаль нічым не адрозніваецца ад савецкай дыктатуры.

## ШЛЯХ СВАБОДЫ

**Тамара Алексій**
**Браслаўскі раён, в. Шауры**

Свабода… што гэта? Канешне, для кожнага чалавека гэта не проста гукі ці літары. Толькі адно слова, а колькі сілы, адна ідэя, а колькі ахвяр…

Кожная цывілізацыя, кожная дзяржава, кожны народ прайшоў сваім шляхам да свабоды. Доўгі час людзі змагаліся са зброяй у руках за права на волю і жыццё, свабоду і роўнасць, зямлю і хлеб. Але ўвесь гэты «скарб» было няпроста здабыць, яго хавалі ад народа за тоўстымі дзвярыма пад моцным замком. А хто ж тады меў ключ ад яго? Хто мог адчыніць запаветныя дзверы і зрабіць людзей свабоднымі? Тыя, хто трымаў уладу, маглі самі даць свабоду і ўсе правы народу. Але жаданне падпарадкоўваць і правіць заўсёды было вялікай спакусай для чалавека. Не кожны пажадае аддаць уладу ў іншыя рукі. Не кожны можа прайсці гэты іспыт уладай. Калі так здараецца, то аб свабодзе не можа быць размовы, гэта ўжо абсалютная манархія, дыктатура ці таталітарызм. І тады, як снежны ком, у грамадстве нарастаюць супярэчнасці і наступае момант, калі свабоду можа сабе здабыць толькі сам народ, пад-

няўшыся супраць улады — адабраць гэты ключ ці разбіць дзверы ў трэскі. З гісторыі нам вядомы не адзін такі прыклад, калі ўспыхвалі паўстанні, развязваліся войны, адбываліся рэвалюцыі, галоўнай мэтай якіх было права на свабоду і роўнасць для ўсіх.

Лозунг «свабоды» неаднойчы гучаў у гісторыі. Адзінае гэта слова падымала на барацьбу цэлыя народы. У Францыі ў час рэвалюцыі канца XVIII ст. быў лозунг «Свабода, роўнасць, братэрства». Падчас паўстання Касцюшкі ў 1794 г. лозунг быў «Вольнасць, цэласць, незалежнасць». У 1830–1831 гг. падчас паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве лозунг быў «За вашу і нашу свабоду».

Прайшлі стагоддзі, а гэтыя словы гучаць і маюць вялікую моц. Амерыканскі пісьменнік Фрэнк Норыс гаварыў: «Свабода не даецца таму, хто яе толькі просіць: свабода — гэта не падарунак багоў. Яна дзіця народа, народжанае ў барацьбе, у смяротных пакутах, яна абмыта крывёй, яна нясе разам з сабой пах парахавога дыму».

Беларусь мае шматвекавую гісторыю, няпростую і нялёгкую, са сваім складаным лёсам. Неаднойчы прыходзілася абараняцца, змагацца за сваю свабоду, адстойваць яе ў крывавай барацьбе. Як яскравы прыклад можна прывесці Грунвальдскую бітву 1410 года. Вынік яе быў вельмі важным нават для сучаснага пакалення. Нашы продкі адстаялі сваю незалежнасць і права на тое, каб іх нашчадкі маглі жыць на роднай зямлі, не падпарадкоўваючыся нікому, не схіляючы галавы. Яны ішлі ў бой пад бел-чырвона-белымі сцягамі, з выявай Пагоні. Гэта сімвалы нашай перамогі, таго, што існуе беларускі народ. Чаму сёння яны не шануюцца, я не магу зразумець. Па тэлебачанні гавораць, што іх выкарыстоўвалі калабарацыяністы падчас Вялікай Айчыннай вайны, і ніхто не ўзгадвае іншага. Навошта было мяняць гэтыя сімвалы — нашыя прадзеды змагаліся пад імі, адстойвалі нашу незалежнасць, каб сёння мы з гонарам маглі гаварыць: «Беларусы — гэта свабодны і незалежны народ». Сімвалы, якія служылі і будуць служыць беларускаму народу. Гэта нашая гісторыя і спадчына, пакінутая нам продкамі.

Для народа самае горшае — гэта забыць свае карані, забыцца на мінулае, на гісторыю. Тады гэта ўжо не народ, а маса людзей, якой нічога не патрэбна, якая не мае сваёй культуры, гісторыі, традыцый. Такіх людзей вельмі проста захапіць і падпарадкаваць, зрабіць рабамі. Гэтай масай вельмі лёгка кіраваць, недарма ў савецкія часы з людзей выбівалі ўсялякія думкі пра мінулае, пра свае карані.

Мы жывём у XXI стагоддзі, калі ў кожнай краіне шануецца гістарычнае мінулае, нацыянальныя героі, барацьбіты за свабоду. Кожны народ мае права на свабоду. І мы не выключэнне. У нашым грамадстве да паняцця «свабода» ставяцца па-рознаму. Адрозніваюцца погляды старых людзей, моладзі, нашых бацькоў. Чаму гэта так? На маю думку, тут вельмі важным фактарам з'яўляецца час. Нашы бабулі, дзядулі, людзі старэйшага пакалення жылі і працавалі ў «іншай» краіне, у СССР, а гэта іншая ідэалогія, іншыя каштоўнасці, іншыя паняцці і ўяўленні. Яны жылі ў тым грамадстве, якое па-

будавалі бальшавікі і ў якое самі верылі. Па радыё і тэлебачанні гаварылі, што такога справядлівага грамадства нідзе больш не існуе, што столькі правоў і свабоды ніхто больш не мае, і людзі ў гэта верылі, бо нічога пра іншыя краіны не ведалі. Любыя ўплывы Захаду забараняліся. А для тых, хто не згодны з ідэалогіяй, былі свае меры: высылка за мяжу, турма, лагер і нават забойства. Такія і ёсць уяўленні большасці савецкіх грамадзян аб свабодзе. Таму і сёння яны сядзяць ціха, ім хапае той «свабоды», якую яны самі сабе абралі…

Але новае пакаленне, моладзь не можа скарыцца з такой «свабодай». Мяняецца час — мяняюцца паняцці. Цяпер існуе інтэрнет, мы можам ездзіць за мяжу. Праўду ад людзей нельга схаваць. У мяне ёсць шмат знаёмых, якія вучацца ў ВНУ, якія працуюць, але ім не даспадобы «савецкі лад жыцця». Хтосьці адразу можа сказаць, што гэта «апазіцыя», ці «анархісты», ці яшчэ хтосьці, але гэта не так. Яны ведаюць нашу гісторыю, культуру, шануюць і паважаюць Беларусь, гэта адукаваныя, таленавітыя людзі. Тадэвуш Касцюшка і Кастусь Каліноўскі таксама былі людзьмі таленавітымі і адукаванымі. Не дурні падымалі народ на паўстанне, ім быў неабыякавы лёс бацькаўшчыны. Менавіта яны зрабілі першыя крокі на шляху да свабоды і незалежнасці. Не было б іх, не было б і беларусаў. Іх, сапраўды, можна назваць «бацькамі» беларускага народа, яны «адкрылі» гэты народ нанова, паверылі ў яго. Гэта выдатныя людзі, якія справай даказвалі сваю любоў да бацькаўшчыны. Але зараз мала хто шануе гэтыя імёны. Наша ўлада ставіць помнікі Сувораву, называе ў яго гонар вуліцы, але кім ён быў для нас? Душагубцам беларускага народа, ён падаўляў паўстанне Касцюшкі і забіў шмат паўстанцаў, не шкадаваў нікога: ні старых, ні дзяцей, ні жанчын. Я прызнаю, што гэта вялікі палкаводзец, але не за нас ён ваяваў і не дзеля нашага народа ён здабываў свае перамогі. Гэта не наш герой.

Сучасная моладзь — за свабоду, супраць прыгнёту, дыскрымінацыі, уціску. І гэта не «здраднікі» і не «апазіцыя», гэта звычайныя беларускія грамадзяне, якім падабаецца гаварыць на роднай мове, слухаць сапраўдныя беларускія песні, а не пародыю на рускія. Гэта іх погляды.

Для мяне свабода — гэта мае магчымасці. Я лічу, што калі чалавек можа гаварыць тое, што думае, не азіраючыся, чытаць тое, што цікавіць, слухаць праўду, а не хлусню, ездзіць у іншыя краіны і глядзець свет — гэта і ёсць свабода. Кожны вольны сам выбіраць тую свабоду, якая яму патрэбна і якая яго задавальняе. Але большасць будзе за адну — за СВАБОДУ ПРАЎДЫ. Я не хачу сказаць, што свабода павінна існаваць без улады. Канешне, яна абмяжоўваецца, без гэтага немагчыма суіснаваць. Нам патрэбны законы і ўлада, якая сочыць за іх выкананнем. Таму існаванне ўлады — гэта ў той жа час і гарант нашай свабоды. Але толькі якой улады? Мы жывём у ХХІ стагоддзі, краіны Захаду ўжо даўно перагналі нас у сваім развіцці. Але мы таксама іх дагонім, і гэта будзе хутчэй, калі мы атрымаем хоць крыху той свабоды, аб якой марым. Я за свабоду слова, свабоду выбару, свабоду лёсу, свабоду жыцця, свабоду думак, свабоду праўды. А скончыць сваё эсэ хачу словамі француз-

скага гісторыка А. Дэбадура: «Чым больш распаўсюджваецца і умацоўваецца свабода, тым больш урады бяссільны рабіць зло, тым больш нацыі схільны дамовіцца паміж сабой і пазбягаць войнаў».

## СВАБОДА

**Вераніка Арэшка**
**г. Мінск**

Свабода, як многа яна для нас значыць? За свабоду людзі ішлі на смерць, бо які сэнс мае жыццё без свабоды? Які сэнс мае жыццё пад ценем чужой улады? Не мае сэнсу такое жыццё, бо гэта ўжо не жыццё, а існаванне. Без свабоды не лётаюць птушкі, не плаваюць рыбы, не палююць драпежнікі. Калі нават жывёлы гінуць у зняволенні, як жа можа жыць без свабоды чалавек? Колькі гадоў увесь свет лічыў, што наша Беларусь пагадзілася з такім існаваннем, што слова «свабода» страціла для беларуса свой сэнс. Не, гэта не так! Падзеі 19–25 сакавіка напомнілі ўсім, што свабодная Беларусь не памерла, яна жыве ў сэрцах неабыякавых людзей, якія, абураныя несправядлівасцю, выйшлі на вуліцы абараняць сваю свабоду, якую вялікай цаной адстаялі нашы продкі. Ёсць яшчэ на Беларусі людзі, гатовыя ўстаць, каб абараніць свой гонар, сваю свабоду.

Такім чынам, свабода яшчэ многа значыць для беларуса, але што дакладна? Што гатовы беларус для яе зрабіць? Чаму заклік «за свабоду» так усхамянуў людзей і прымусіў іх выйсці на вуліцы? Пра гэта я запытала сваіх знаёмых — удзельнікаў сакавіцкіх падзей. Гэта маладыя людзі 15–18 гадоў, якія ўдзельнічалі ў акцыях на Кастрычніцкай плошчы, у мітынгу 25 сакавіка, пераважная большасць — сябры няўрадавых маладзёжных арганізацый.

***Чым для цябе з'яўляецца свабода?***

- Магчымасцю прымаць уласныя рашэнні, мець свой погляд, ні ад кога не залежны, думаць у сваім кірунку.
- Незалежнасцю ад іншых людзей, ад поглядаў асяроддзя.
- Магчымасцю выказаць свае думкі, сваё меркаванне наконт якой-небудзь падзеі і не баяцца, што за гэта пасадзяць, звольняць з працы, выключаць са школы.
- Галоўнай жыццёвай каштоўнасцю, без якой немагчыма нармальна жыць, бо чалавек несвабодны — гэта раб, а раб нармальна жыць не здольны.
- Натуральным правам кожнага чалавека, якое ён павінен адстойваць любой цаной.
- Свабода — гэта не ўсёдазволенасць, гэта адказнасць за кожнае сваё рашэнне, за кожны ўчынак.

- Гэта жыццё без пастаяннага страху, з пачуццём асабістай годнасці, якой нічога не пагражае.
- Жыццё без прымусу.
- Веданне таго, што я вольны зрабіць усё, зразумела, у рамках маралі і закону.
- Свабода — шматбаковае паняцце, кожны закранае толькі нейкую частку ад цэлага, словамі апісаць свабоду немагчыма, гэта як апісваць смак паветра, адно толькі пэўна — жыць без яе немагчыма.

***Што ты мог бы зрабіць дзеля свабоды?***

- Напэўна, усё, што ў маіх сілах.
- Растлумачыць іншым людзям, што ж такое свабода, чаму яе трэба цаніць. Паспрабаваць арганізаваць іх дзеля яе абароны.
- Дзеля свабоды не страшна і адсядзець у турме.
- Дзеля свабоды можна чым-небудзь ахвяраваць.
- Змагацца з тымі, хто яе прыціскае, любымі спосабамі.

***Як лічыш, чаму за лозунгам «за свабоду» пайшло так шмат людзей?***

- Таму што ім абрыдла такое жыццё, захацелася трохі свабоды, захацелася, каб іх погляды перасталі ігнараваць.
- Моладзь пайшла за модай. Быць свабодным — гэта цяпер модна, старэйшае пакаленне, пэўна, таму, што адчула: за гэтым лозунгам стаіць рэальная сіла.
- Захацелася перамен, станоўчы прыклад «каляровых рэвалюцый» паказаў, што і нам не позна нешта мяняць.
- Таму што ёсць рэчы, якія трэба рабіць, нават калі не да канца разумееш іх. Абараняць свабоду — гэта якраз адна з гэтых рэчаў.

***Ці хапае ў нашым грамадстве свабоды?***

- Адназначна: не!

А што асабіста для мяне значыць свабода? Я згодная з кожным з выказванняў і хачу дадаць яшчэ, што свабода — гэта рухавік прагрэсу, паветра для цывілізацыі. Бо як жа можа развівацца несвабодная нацыя? Раней ці пазней яна бясследна згіне…

Колькі на свеце людзей, столькі і поглядаў на свабоду, але ў адным большасць згодна: свабоду трэба абараняць, няма нічога, што было б важней за свабоду, няма нічога, за што можна было б аддаць свабоду. Ужо шмат стагоддзяў чалавек ведае гэта, гісторыя Беларусі дае нам багата прыкладаў: Грунвальдская бітва, бітва пад Оршай, утварэнне БНР, розныя паўстанні — пералічваць можна вельмі доўга. Хапае доказаў таго, што беларусы — свабодалюбівая нацыя. Дык калі нам не хапае свабоды, калі мы гатовы шмат дзеля яе зрабіць, калі гэта той лозунг, за каторым людзі гатовыя ісці нават у турму, — ці не трэба аб гэтым задумацца, ці не прыйшоў нарэшце час штосьці змяніць?

# ШТО ТАКОЕ СВАБОДА?

**Вольга Бляўская**
**г. Маладзечна**

Свабода — самая дарагая агульначалавечая каштоўнасць. Чалавек заўсёды нараджаецца свабодным, таму свабода — гэта натуральнае права чалавека.

Што ж такое свабода? Гэта пытанне задае сабе кожны чалавек. Кожны і адказвае па-рознаму. Некалькі разоў я чула, як падлеткі мне адказвалі: «Як паступлю ва універсітэт і з’еду ад бацькоў, тады я стану свабодным, буду рабіць усё, што захачу!» Дык няўжо ж людзі, бачачы на падлетках значкі або нашыўкі «Я за свабоду», думаюць, што тыя падлеткі так і разумеюць свабоду — рабіць усё, што захачу. Не, паважаныя мае, такіх хіба адзінкі. Моладзь разумее многае, у яе свежыя погляды, і ёй патрэбна свабода.

Хачу падзяліцца сваімі думкамі аб свабодзе.

За свабоду заўсёды змагаліся нашы продкі. Пагартаем старонкі гісторыі.

Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі — гэта змаганне за свабоду ад прыгнёту Расіі. Паўстаў увесь народ, які не хацеў жыць пад прыгнётам і цярпець здзекі. Яшчэ раз узяліся нашы прадзеды за зброю ў 1812 годзе, бачачы ў Напалеоне чалавека, які зможа адрадзіць ВКЛ і пазбавіць іх ад залежнасці Расіі. Паўстанне Кастуся Каліноўскага — яскравы прыклад, які дае веру і надзею нават сучаснаму беларусу. І ўсе гэтыя паўстанні былі за свабоду ад прыгнёту, прыгону, гвалту, эксплуатацыі — гэта было змаганне за свае чалавечыя правы. За права жыць на нашай зямлі, тварыць, аб нечым марыць і гэтую мару ператвараць у рэальнасць, жыць, а не быць быдлам, запалоханай істотай, якая навязана на ланцугу і мае толькі жывёльныя інстынкты. Людзі не хацелі, каб іх лічылі рабамі.

Не, усё! Хопіць здзеку! Чалавек ёсць чалавек, а не звер! І яму патрэбна свабода для самавызначэння, выяўлення ўласнай волі.

Як і тады, цяпер нам патрэбна свабода дзеянняў, каб мы маглі дасягнуць сваіх жыццёвых мэт. Але як такое будзе, калі, напрыклад, мае сябры захацелі выказаць сваю думку, а іх або выганяюць з універсітэта, або запісваюць у ворагі. Яшчэ пытанне: чаму падчас панавання Расіі на нашай тэрыторыі так знішчалі мову? Нават у тыя гады не было свабоды для слова (што ўжо гаварыць пра свабоду слова цяпер). Бо маскаль не дурны і разумеў: чым хутчэй знішчыць мову, тым хутчэй знікне нацыя — і застануцца толькі «рускія», а краіна ператворыцца ў «Северо-Западный край». Не! Тады не пакарыліся і цяпер не жадаем мірыцца.

Мы жывём у незалежнай краіне. А незалежнай ад чаго? Незалежнай звонку, але ж кожная краіна цяпер мае ўзаемасувязі і крышку залежная ад іншай, бо развіваемся мы разам. Ад Расіі? З якой мы змагаліся спакон вякоў? Дык наша ўлада яшчэ як залежыць ад гэтай дзяржавы. І калі глядзець, што

робіцца ўнутры краіны, дык пабачым, што залежым мы цалкам ад пануючай улады, якая стварае свае законы, а тым законам, якія стварыў народ, улада не жадае падпарадкоўвацца, таму і гне пад сябе Канстытуцыю!

Шмат людзей не ведае праўды пра падзеі, якія адбываюцца сёння, бо не маем мы свабоды слова, друку, а толькі чуем з розных бакоў хлусню, жывём у няпраўдзе. Бо такімі людзьмі лягчэй кіраваць! Хаця ўлада павінна разумець, што нічога так не дапамагае развіццю грамадства, як магчымасць свабодна выказваць погляды на палітычныя і грамадскія справы. Калі ж урад баіцца галоснасці, гэта выклікае падазрэнні, што ён жадае схаваць пэўныя таемныя злоўжыванні. Мне вельмі падабаецца думка філосафа Вейса: «Чым больш рэтраградны ўрад, тым больш настойліва імкнецца ён перашкаджаць грамадскаму развіццю, чым больш, наадварот, ён шчыры, тым ахвотней садзейнічае гэтаму развіццю, кіруючыся простай і зразумелай думкай, што адукаваны народ лепш ацэніць дабро, якое яму зробяць, і выкажа вернасць і павагу да закону і да кіраўніка. Таму разумны жадае для ўласнай славы распаўсюджання адукацыі і навінаў, а дурны — наадварот, шукае, як падушыць усялякую ідэю праўды і справядлівасці для таго, каб лепш схаваць упоцемку нікчэмнасць сваіх поглядаў і сваё ўласнае невуцтва».

Чаму б нам не паразважаць аб свабодзе выбару? Магчыма, будзе адказ такі: «У нас жа ёсць такая свабода». Але я гэта палічу за памылку, бо гэта не выбар, калі ён складаецца з двух варыянтаў альбо з аднаго (што цяпер характэрна для нашай краіны). Чалавек павінен развівацца, і для гэтага ў яго павінен быць выбар: куды пайсці, што зрабіць, які шлях выбраць для самавызначэння, шмат варыянтаў працы.

Недзе я прачытала: «Прадаць свабоду для таго, каб мець магчымасць існаваць, — такі самы звычайны людскі лёс». І гэта сёння горкая праўда.

А на пытанне «Ці ёсць для мяне рэчы, важнейшыя за свабоду?» я адкажу: «Няма, бо свабода для мяне ў тым і заключаецца, каб жыць, тварыць, любіць, выказваць свае погляды і рабіць правільна, каб потым можна было азірнуцца ў мінулае і сказаць, што і я прыняла ўдзел у развіцці нашай краіны».

Я за свабоду!

## МАЯ СВАБОДА

**Зміцер Пінчук**
**г. Пінск**

Што такое свабода? Свабода — гэта добра. Свабода — гэта прыемна. Свабода — гэта добрыя словы, але ў нашай краіне толькі словы, не больш. Можна выйсці на вуліцу і спытаць у людзей, ці свабодныя яны. Яны адкажуць у большасці сваёй, што яны свабодныя. А ці сапраўды яны свабодныя? Адказ

вельмі просты. Большасць іх адказала так, таму што гэтыя людзі слова «свабода» разумеюць прымітыўна. Так, яны не сядзяць за кратамі, яны свабодныя. Але ёсць іншая свабода, свабода, аб якой яны не задумваюцца. Гэта свабода мець аб'ектыўную інфармацыю! Яе ў нас няма. Пры рабоце над гэтым матэрыялам у мяне была мэта пісаць па магчымасці без палітычных уплываў, але ўсё ж такі я зразумеў, што без гэтага нельга. Свабода стаіць побач са словам «справядлівасць», лічу, што гэтыя словы дапаўняюць адно другое.

Беларусы са старадаўніх часоў жылі ў большасці ў несвабодзе, у іх ментальнасць укаранілася не свабода, а палон, палонныя думкі і залежнасць ад каго-небудзь. Толькі цвет беларускай нацыі выяваў за свабоду і незалежнасць свайго народа. Найлепшым прыкладам гэтага можа быць паўстанне 1863–1864 гг. на чале з Каліноўскім. За гэтым чалавекам пайшлі многія, многіх потым пакаралі за гэта, бо такі быў час.

Сёння такіх патрыётаў значна менш. Лепшыя з беларусаў адстойвалі сваю свабоду 19–25 сакавіка. Яны адстойвалі свабоду слова, свабоду выбару, і кожны з гэтых людзей ўкладаў у агульную СВАБОДУ часцінку свайго разумення слова «свабода». Але ў галоўным іх думкі супадалі. Але іх таксама пакаралі, нягледзячы на тое, што час ужо іншы!

Кожны народ ганарыцца сваёй мовай, таму што мова — вызначальная рыса кожнага народа. У краіне пад назвай Беларусь свабоды роднай мовы, на жаль, няма. Наша ўлада затаптала беларускую мову, мову Янкі Купалы і Якуба Коласа, мову, на якой гаварылі нашы продкі. Я пішу гэты артыкул, час ад часу карыстаючыся слоўнікам, але гэта не толькі мая віна. Гэта перш за ўсё віна тых людзей, якія таптaлі і топчуць мову. Гэтыя людзі — ганьба для Беларусі. Мы дзякуючы ім несвабодныя ў сваёй мове, дзякуючы ім мы чуем вакол не мову, а «язык». На жаль, прэзідэнт з'яўляецца галоўным зневажальнікам мовы, і гэта можна ўбачыць па тэлевізары падчас яго выступаў. Для мяне заўсёды будзе добрым прыкладам, як ужываюць родную мову на Украіне.

Месца для свабоды ёсць у сэрцах усіх разумных людзей. Свабода — гэта тое, да чаго мы павінны цяпер імкнуцца, бо жывём за кратамі! Мы павінны дамагчыся вызвалення і свабоды. Хоць мы і жывём у татальнай несвабодзе, але жыццё на гэтым не заканчваецца. Трэба адстойваць сваю свабоду, нават калі ўлада ваюе супраць цябе!

На заканчэнне хачу сказаць, што маё разуменне свабоды адпавядае свабодзе, пра якую спявае Кася Камоцкая (словы М. Анемпадыстава):

…
*Мая свабода — зь ветрам нязгода*
*Ды асалода супрацьстаяньня*
*Мая свабода — човен падводны*
*Паміж Сцылаю ды Харыбдай*
*Мая свабода — дом папяровы*
*Паміж Гамораю ды Садомам*

*А там за домам край невядомы*
*Пад белым сьнегам пад белым сьцягам.*
*…*
*Пад белым сьцягам*
*з чырвонаю стужкай*
*Мая свабода…*

Жыве свабодная Беларусь!!! Жывуць свабодныя беларусы!!!

## СВАБОДА ПЕРАМАГАЕ НЯВОЛЮ, ЯК ДАБРО ПЕРАМАГАЕ ЗЛО

**Арцём Германовіч**
**г. Ліда**

*Бог стварыў свет, каб кожны*
*карыстаў з вольнасці справядлівай.*
Кастусь Каліноўскі

Гісторыя нашай Бацькаўшчыны поўніцца барацьбой за свабоду. На самым пачатку гэта адваёва Полацкім княствам сваёй незалежнасці. Тады нашы продкі-крывічы смела ішлі за сваю зямлю супраць кіеўскіх ды наўгародскіх дружын. Пасля аб'яднаная Міндоўгам Літва адбівала набегі галіцка-валынскіх князёў. Найбуйнейшая з бітваў Сярэднявечча — Грунвальдская — назаўсёды пазбавіла нашу зямлю ад пагрозы з боку тэўтонаў. Аршанская бітва — наша баявая слава, паказала, што супраць 80 тысяч акупанцкага войска можа выступіць 30-тысячная армія, якая абараняе свае дамы, сем'і, краіну і свой народ, — і перамагчы з невялікімі стратамі. Ужо ў часы існавання Рэчы Паспалітай беларуска-польскае войска на чале з каралём Сцяпанам Батурам вызваліла Полацак і вялікія тэрыторыі, якія складаюць трэцюю частку плошчы сучаснай Беларусі. У перыяд 1644–1657 гг. Княства магло назаўсёды страціць сваю свабоду. Коштам той вайны была палова жыхароў Беларусі, якія адышлі ў іншы свет ад рук «царскіх вызваліцеляў». Сваю свабоду беларусы страцілі ад нападаў тых жа ўсходніх суседзяў. І тады нашы продкі не аддалі сваю зямлю злачынцам без бою. Ліцвінскія шляхціцы і сяляне падняліся на паўстанне, якое ўзначаліў Тадэвуш Касцюшка. Хутка яно было патоплена ў крыві, а беларуская зямля на 200 гадоў трапіла ў палон. Народнае паўстанне 1863 года на чале з Каліноўскім было пераадолена, а яго ўдзельнікі павешаны альбо высланы. Але і гэта не спыніла духу вольнасці. Паўстанне Беларускай Народнай Рэспублікі, Слуцкага збройнага чына, Таварыства беларускай школы стала сімвалам змагання за свабоду свайго народа. Людзі, якія ахвяравалі сабой дзеля Бацькаўшчыны, сталі дысідэнтамі.

Адны з іх былі забіты, як Тарашкевіч, іншыя гнілі ў турмах, як Жылуновіч, некаторыя загінулі «пры невядомых абставінах», як Купала. Яны заклалі фундамент сучаснай барацьбы за Волю і Долю. Новымі вобразамі змагароў сталі Быкаў, Караткевіч, Барадулін, Пазьняк. Гэтыя людзі перамагалі і перамагаюць праўдзівым словам, аберагалі і аберагаюць родную Беларусь. Яны пачалі ствараць моцную духоўную апору, якая ўзгадуе сыноў і дачок Беларусі. Сёння такая асветніцкая праца падаўляецца, але ў супрацьдзеянні нараджаецца ўсё прагрэсіўнае. Нягледзячы на ўсялякія папярэджанні, выдаюцца газеты на беларускай мове («Наша ніва», «Народная воля»), друкуюцца кнігі такіх аўтараў, як Уладзімір Арлоў, Анатоль Сыс, Адам Глобус, Андрэй Хадановіч, гучаць беларускамоўныя песні ў выкананні Зміцера Вайцюшкевіча і гуртоў «Крама», «N. R. M.», «Indiga», «Garadzkija». Гэта прымушае задумацца кожнага беларуса: чаму ўсё беларускае нараджаецца на сваёй зямлі ў пакутах? Беларускае слова абуджае тое, што жыве глыбока ў сэрцы. На песнях беларускіх гуртоў, газетах, кнігах вырас мой знаёмы. Гэта Сяржук Чайка, намеснік старшыні лідскай філіі Маладога Фронту. Праз свае погляды ён неаднаразова канфліктаваў з дырэктарам каледжа, дзе ён вучыцца, з КДБ. Другога сакавіка гэтага года Сяргей быў удзельнікам сустрэчы выбарцаў з Аляксандрам Мілінкевічам у Мінску, браў удзел у Дні Волі–2006. Я ўзяў у Сержука інтэрв'ю:

*Што такое асабістая свабода?*

Чалавек адчувае сябе свабодным, калі ён можа думаць, вызначаць свой лёс, выбіраць мову, на якой яму размаўляць. Свабода — адсутнасць прыгнятальнікаў.

*Што прывяло цябе да тваёй дзейнасці, да новага жыцця?*

Заўжды памятаю: быў я малы, а мой старэйшы брат слухаў беларускую музыку, я звыкся з ёю, палюбіў. Гэта была тая музыка, якая вучыць, а не проста «шоў». Я зразумеў сэнс песень, і цяпер музыка беларускіх гуртоў — навука і адпачынак для мяне. Выхаваў мяне ў вольным духу бацька. Ён ніколі не баяўся выказваць свае думкі.

*Што цяпер падтрымлівае тваю свабоду, што не дае звярнуць з гэтага шляху?*

Я зразумеў і адчуў, што я не адзін такі, што нас шмат, што ўсе мы салідарныя. Асабліва ярка гэта было бачна падчас Дня Волі. Дзесяткі тысяч чалавек у святочным настроі сабраліся разам на вуліцах Мінска. Сігналы даносіліся амаль з кожнай машыны, што праязджала побач. Гэта даказала ўсім, што мы не проста «купка адмарозкаў», але група найбольш смелых, якія маюць падтрымку сярод насельніцтва. На мяне заўсёды ўздзейнічае досвед нашых лідэраў. Прыкладам для мяне з'яўляюцца Зміцер Дашкевіч, Павел Севярынец, Зянон Пазьняк. Яны, нягледзячы на рэпрэсіі, працуюць на карысць Радзімы.

*У тваім сэрцы застаўся страх, які ў пэўны момант пераўтварае цябе ў звычайнага абывацеля?*

Я пазбавіўся ад яго. Засталося перажыванне за маму. Яна перажывае за мяне, я — за яе. Ёй цяжка будзе ўспрыняць факт, што мяне асудзілі ці не-

шта накшталт таго. Я ўжо не баюся, што мяне выключаць з каледжа, хоць нядаўна такая боязь яшчэ была.

*Чаго ты чакаеш ад свабоды ў нашай краіне?*

Я хачу жыць у свабоднай краіне, дзе чалавек можа не баяцца, што яго звольняць з працы, выключаць з ВНУ з-за яго «дысідэнцкіх» думак. Я імкнуся да гэтага, бо мяркую: хто, калі не я, будзе рабіць гэта? чаму мы ўскладаем нейкія чаканні і абавязкі на іншых?

*Ёсць нешта вышэйшае за свабоду?*

Здаецца, не. Важныя такія якасці, як добразычлівасць, адкрытасць, але яны не могуць існаваць без свабоды. Свабода, усё ж такі, найвышэйшая каштоўнасць.

*Што для цябе ёсць нацыянальная свабода?*

Каліноўскі казаў: «Тады будзеш свабодным, калі маскаля над табой не будзе!» Маскаль — гэта вобраз. Вобраз ухвалення чужынскага, але не свайго. Цяпер мы зневажаем беларускую мову, сімвалы, карані. Таму Беларусь стане свабоднай краінай, калі мы навучымся не прымаць бяздумна таго, што нам навязваюць іншыя, але любіць сваё.

*Якімі сродкамі мы павінны карыстацца, каб свабода нарэшце перамагла рабства?*

Мы мусім аб'яднацца і перамагчы свой страх, усялякія дробныя боязі, зразумець, што мы не адны, што нас вельмі шмат, тады нацыя стане свабоднай.

*Калі ты прыйшоў да актыўных дзеянняў, калі ў тваім сэрцы адбыўся выбух?*

Калі нацыянальныя сімвалы былі заменены язычніцкімі гербам і сцягам, я зразумеў (хоць быў яшчэ малы), што гэта супраць волі народа, што гэта знак рабства. З кожным годам я ўсё больш пераконваюся ў тым, што я на правільным шляху. Цяпер я не ўяўляю сябе без свабоды ў душы, разумею, што ўжо не вярнуся назад.

*Калі адбылася першая сутычка ў тваім жыцці, звязаная з тваімі поглядамі?*

На першым годзе навучання ў каледжы я прынёс у сваю групу «Замалёўкі з беларускай натуры». Гэта былі карыкатуры на сістэму. Са мною вучыўся хлопец, бацька якога быў у той час намеснікам старшыні гарвыканкама. Аднакурснік расказаў пра мае погляды бацьку, а той — дырэктару каледжа. Дырэктар мяне і выклікаў, пачаў «прамыўку мазгоў», гэта было вельмі нечакана для мяне. Тады я адчуў абурэнне. Гэтая размова падштурхнула мяне да ўступлення ў Малады Фронт.

Пасля я выказаў яму свае меркаванні, а ён яшчэ дадаў:

— Памятаю, як Пазьняк сказаў: «Не свабода і правы чалавека найперш важныя для Беларусі, але незалежнасць». Незалежнасць у нас ёсць, і цяпер мы мусім адваяваць Свабоду і Правы. Я хачу сам зрабіць штосьці для нашай Свабоды і чакаю моманту, калі я выйду на наш беларускі прастор

і ў твар мне будзе патыхаць Вецер Свабоды, а над установамі гарадской улады будзе лунаць сімвал нашай Волі — бел-чырвона-белы сцяг!

<…>

Агульнанародная Свабода з'яўляецца тады, калі вольных ад усялякіх страхаў і заганаў людзей становіцца больш, чым тых, што прызвычаіліся функцыянаваць па загадах. Вялікая Свабода складаецца з маленькіх свабод. Калі свабоднага чалавека яшчэ можна часова ізаляваць, то свабодную нацыю ўжо не вернеш у рабскае былое. Свабода перамагае Няволю, як Дабро перамагае Зло…

Сёння беларус не можа вызначыць, колькі яшчэ ў краіне такіх, як ён, тых, што прагнуць свабоды. Для нашай агульнай Волі трэба зрабіць толькі адзін крок —пераадолець свой страх перад «начальствам». Толькі калі ўсе будуць разам, мы атрымаем тую свабоду, якой не бачылі ні нашы бацькі, ні дзяды, ні прадзеды. Гэта няпростая праблема, але вырашальная. За свабоду Беларусі мы мусім разам памаліцца Богу. Вера выратуе нашу зямлю. Я ўпэўнены, што ўжо хутка наша змаганне, наш двухсотгадовы шлях да Волі і Долі скончыцца перамогай справядлівасці, бо Ісус Хрыстос сказаў: «Шчасныя тыя, што прагнуць і смагнуць справядлівасці, бо яны насыцяцца».

## СВАБОДА Ў ТВОРЧАСЦІ НАСТАЎНІКА

**Кацярына Гівойна**
**г. Гродна**

*…Углядайцеся ў прывычнае — і вы ўбачыце нечаканае,*
*Углядайцеся ў непрыгожае — і вы ўбачыце прыгожае,*
*Углядайцеся ў простае — і вы ўбачыце складанае,*
*Углядайцеся ў малое — і вы ўбачыце вялікае…*
З японскай філасофіі

Вецер свабоды часта мяняе свой напрамак. Як не разгубіцца, знайсці свой шлях, каб усё жыццё крочыць, цвёрда трымаючыся на нагах?..

Напэўна, калі запытаць у чалавека, што такое свабода, як ён яе разумее, што яна значыць для яго — кожны знойдзе свой адказ.

Але ці кожны можа сказаць, што яго праца і ёсць для яго свабодаю і, пражыўшы шмат гадоў, заявіць, што ўсё жыццё ён быў свабодным чалавекам, нягледзячы на тое, што шмат разоў амаль не губляў любімую працу, а то і саму свабоду.

Алесь Мікалаевіч Белакоз — былы настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гудзевіцкай сярэдняй школы, стваральнік Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея. Настаўнік з вялікай літары, таленавіты ча-

лавек, які распрацаваў сваю методыку навучання і працаваў па ёй, цікавы суразмоўца, які заўжды чакае гасцей і рады кожнаму, хто пераступае парог яго хаты.

Алесь Мікалаевіч яшчэ юнаком адзначыў для сябе галоўнае — веданне гісторыі свайго роднага краю і роднай мовы. Таму выніковым і быў першы крок — у настаўніцкую семінарыю.

Другім крокам была яго праца як Настаўніка. Сваім асабіста распрацаваным падыходам, новай (сваёй жа) методыкай ён змог выклікаць у вучняў не толькі задавальненне ад вывучэння роднай мовы, але і заслужыў іх павагу і любоў.

<...>

Трэцім крокам было стварэнне музея, які адлюстраваў любоў Алеся Мікалаевіча да гісторыі Беларусі. Менавіта ў ім знаходзяцца звесткі аб нашых вёсках і іх жыхарах, аб простым чалавеку і яго побыце, пачынаючы з мінулых часоў да сённяшніх. Ні адну працу ён не рабіў без дапамогі вучняў. Алесь Мікалаевіч не хавае, што музей ствараўся дзякуючы дзецям. Менавіта яны складалі вершы, збіралі матэрыял, прыносілі хатнія прылады, вышыўкі, посцілкі, запісвалі паданні, аповеды людзей, якія жылі побач. І гэта была аснова музея. Кожны экспанат шмат значыць, пра многае распавядае.

Але і тут знайшлася свая «адміністрацыя», якая ўбачыла недакладнасці, якія не адпавядаюць САВЕЦКІМ законам. Шмат разоў Алесь Мікалаевіч пытаўся: «Скажыце, калі ласка, што ў нас не так?»

<...>

Алесь Мікалаевіч жыве ў невялічкай вёсачцы Ляткі. Маленькая хатка, дзе ўсё проста, утульна і свабодна, нішто не абмяжоўвае, а наадварот, дапамагае ў працы. Алесь Мікалаевіч па-ранейшаму працуе, але працуе ён дома, бо не можа жыць без працы. На яго рабочым стале ляжаць часопісы, папкі, лісты, на якія трэба даць адказы, бо лісты гэтыя з розных куткоў свету, стаіць друкавальная машынка, камп'ютэр, сканер, прынтэр, ксеракс. Дзіву даешся: чалавеку амаль восемдзесят гадоў, а ён па-ранейшаму апантаны працай, валодае сучаснай тэхнікай, вядзе перапіску з рознымі людзьмі, піша ўспаміны. У Алеся Мікалаевіча няма вялікіх грашовых зберажэнняў, але ў яго ёсць усё для працы, і гэта дае яму пачуццё свабоды. Ён ніколі не быў за межамі Беларусі, але шмат хто за яе межамі ведае Алеся Мікалаевіча Белакоза.

Усяго тры крокі — і ўсё жыццё чалавека...

Як прайсці гэтыя крокі, каб не схіліцца, каб утрымацца? Што трэба ўсвядоміць для сябе, каб ісці па жыцці з высока ўзнятаю галавой? Якая яна — свабода? У чым і дзе яе шукаць? Пытанняў шмат, але ніхто не адкажа на гэтыя пытанні, акрамя самога сябе. І калі ты гэта зразумееш, ты зразумееш, што ж такое сапраўдная свабода.

## ВЕЦЕР СВАБОДЫ

**Анастасія Жураўская**
**г. Глыбокае**

Свабода — паняцце вельмі шырокае. Па-першае, гэта можа быць свабода аднаго чалавека або ўсяго грамадства. Кожны разумее свабоду па-свойму, ў кожнага сваё ўяўленне аб ёй. Але галоўнае — гэта прававы статус асобы. Свабода ўшчыльную звязана з правамі чалавека. Абмяжоўваюцца правы — абмяжоўваецца і свабода. Я лічу, што свабода — гэта здольнасць выбіраць і дзейнічаць на падставе ўнутраных разваг, а не знешняга прымусу. Вядома, у нашай краіне свабода існуе, але яна часам абмежаваная. Існуе свабода слова, свабода выбару, свабода дзейнасці. Але ў нас не кожны грамадзянін можа карыстацца гэтай свабодай.

Я лічу, што важней за свабоду можа быць толькі жыццё. Права на жыццё мае кожны чалавек, і ніхто не можа яго адабраць. Тое, што важней любых паняццяў і разважанняў — гэта жыццё і свабода. Гэтыя словы вельмі цесна звязаны. Калі нас нехта пазбавіць свабоды, то могуць пазбавіць і жыцця.

*Як вольная птушка лунае ў нябёсах,*
*Так наша свабода гадуе наш дух.*
*Але калі птушку пазбавіць свабоды —*
*У адначассе не стане іх дзвюх.*

Некаторыя людзі жывуць, не заўважаючы, што яны несвабодныя, бо ні ў чым не маюць патрэбы, таксама і ў свабодзе. Іх свабода падобная да птушкі, загнанай у клетку, якая не імкнецца да вольнага жыцця, да нябёсаў, бо не зважае на абмежаванні яе свабоды.

Ёсць і іншыя людзі, якія без свабоды не бачаць сэнсу жыцця, — гэта такія, як я. Але, на жаль, у жыцці не ўсё так гладка, як здаецца. Часам, каб адчуць сябе свабодным, трэба змяніць месца жыхарства альбо памяняць свае жыццёвыя каштоўнасці, свае погляды, адкрыта выказаць свае думкі, меркаванні. Але зрабіць гэта не заўсёды ўдаецца, бо чалавек пазбаўлены магчымасці ажыццяўляць свае правы. Я лічу, што ў нашым грамадстве людзям трэба змагацца за права быць свабоднымі. Не трэба здавацца, бо гэта наш бясцэнны скарб, наша багацце, наш выбар.

## ПРАБЛЕМА СВАБОДЫ

**Кацярына Ліпень**
**г. Мінск**

Свабода ў грамадстве — гэта свабода ва ўсіх сферах чалавечага жыцця. Чалавек толькі тады можа лічыць сябе паўнапраўным грамадзянінам

сваёй краіны, калі ён можа ўплываць на развіццё сваёй Радзімы, на ўсе працэсы, якія праходзяць у грамадстве.

Сёння існуе праблема свабоды слова. Мы знаходзімся ў Еўропе, развітым цэнтры свету, таму нам, каб дасягнуць дэмакратычных нормаў, трэба пашыраць свабоду друку, тэлебачання. Вельмі часта ў газетах нам апісваюць падзеі толькі з аднаго боку. Хацелася б, каб каментарый быў больш разнастайны. Увогуле, на мой погляд, трэба ў нашай краіне павялічваць колькасць газет і часопісаў, вельмі мала мы атрымліваем інфармацыі.

Шкада, што ў нас амаль няма аўтараў, якія апісвалі б сённяшняе жыццё, а калі і ёсць, вельмі дрэнна, што я — мінчанка, якая жыве ў сталіцы еўрапейскай дзяржавы, — не ведаю гэтага. Але тут унясу папраўку, год таму назад я пазнаёмілася з сучасным пісьменнікам і журналістам Сяргеем Законнікавым. Прыемны ўспамін застаўся ў мяне ад гэтай сустрэчы.

Вельмі турбуе мяне свабода слова на тэлебачанні. Па-першае, мала ў нас інфармацыйна насычаных каналаў; па-другое, толькі афіцыйны погляд на падзеі. Гэта было вельмі заўважна ў сувязі з апошнімі падзеямі ў краіне (выбары і пратэсты пасля выбараў). Але тут нельга не адзначыць, што кантраляваць інфармацыю, якая паступае да людзей, трэба, бо кожны, нават не зусім разумны чалавек, можа захацець умяшацца ў справы краіны. Гэта можа прывесці да вострых сацыяльных і палітычных сітуацый. Таму я лічу, што ва ўсім патрэбна мера.

<...>

Свабода не можа быць поўнай. Што добра для аднаго чалавека, не падыходзіць для другога, трэба часам стрымліваць сваю свабоду, каб не перашкаджаць жыццю іншых. Для мяне свабода — гэта магчымасць рэалізаваць сябе ў жыцці.

## ВЕЦЕР СВАБОДЫ

**Павел Махінаў**
**г. Гродна**

Я — свабода. Я іду па вуліцы. Насустрач дзесяткі розных людзей. Я гляджу на іх, я назіраю за імі. Я імкнуся глядзець ім у вочы, але... яны пустыя. Я крочу па зямлі і даследую людзей. Я баюся за іх. Асцярожна пытаю сябе: «Што патрэбна людзям? О, каб вы ведалі, як мяне прагнуць людзі. Як яны галосяць па мне, а самі пры гэтым не ідуць да мяне, а толькі крычаць: «Няма! Дай! Свабоду!». Колькі я ні даравала людзям сябе, ім заўсёды мала. Людзі, нібы ненажэрныя істоты, прагнуць яшчэ і яшчэ. Ім хочацца рабіць усё свабодна, каб ніхто ім не перашкаджаў, каб усё было дазволена — што хочаш, то і рабі. Як казаў адзін: «Пивка и сигарет можно было бы купить, а то придираются... и родители с учителями чтобы не приставали, задрали...». А другі так

уяўляе свабоду: «Чё хочу, то и делаю, и никакие менты не придираются». І я павінна дараваць скарб свабоды гэтым нікчэмным чалавечкам? Я павінна патураць іхнім вартым жалю жаданням? «Мы свободны. Нам всё разрешено. Мы все от рождения свободны. А ты пошёл вон. Не мешай мне быть свободным…»

О! Якая файная свабода! Жыць дзеля сябе. Ці ж гэта людзі? Гэта жывёлы!!! Гэта істоты, якія паддаліся інстынктам і жаданням жывёліны. Ці ж я павінна існаваць дзеля гэтага? Не. Я лепей памру, каб да такога не дайшло. Гэта «грамадства» з такой свабодай? Яны толькі ведаюць слова «свабода», а што гэта значыць, ім «да аднаго месца». Ім напляваць, што нехта пакутуе, ім галоўнае — яны самі. Эгаісты! Прагнуць мяне, вышэйшую каштоўнасць, толькі сабе. Калі такім людзішкам я пачну даваць сябе, кім яны стануць? Жывёламі. І будуць весці сабе, як парсюкі… Жах…

Салёная кропля скацілася па маёй шчацэ. Атрымоўваецца, што ўсё кепска. Але ёсць і тыя, у каго такіх мізэрных жаданняў няма. Што ў іх за мэты, якія малітвы да мяне? Яны хочуць, не, яны прагнуць размаўляць на роднай мове. Яны хочуць выказваць свае думкі і не думаць, што нехта потым данясе «куды трэба». Дзейнічаць вольна, а не пад прымусам. Каб у іх быў выбар, альтэрнатыва. Каб іх ніхто не даймаў, за тое, што яны «не нашы» і што думаюць «няправільна». Але галоўнае, каб яны не баяліся за жыццё сваіх блізкіх і за сваё ўласнае. Каб не мелі адчування непаўнавартаснасці ў сваіх кроках да будучыні. Яны хочуць мець упэўненасць у будучыні, у лёсе Бацькаўшчыны, у лёсе сваіх дзяцей і ўнукаў… Каб была магчымасць сказаць «ТАК» або «НЕ». Такіх людзей мала. Яны прагнуць волі, свабоды, каб зрабіць гэта грамадства лепшым і змяніць гэты звар'яцелы, змрочны свет. На жаль, іх становіцца ўсё менш і менш…

Людзі падобныя да птушак. Іх крылы сціснуты. Калі рука свабоды вызваліць іх ад гнёту, яны паляцяць у неба. Кожны сам выбірае свой шлях. Кожны сам выбірае сваё неба. Нехта будзе лётаць каб проста лётаць. А нехта дзеля вялікай каштоўнасці — СВАБОДЫ. У такім небе ярка свеціць сонейка, плывуць белыя аблокі. Там гуляе ветрык. Яны жадаюць, каб моцны вецер дзьмуў ім у твар. Каб такіх вольных птахаў было больш і больш. Каб ЖЫЦЬ дзеля людзей, дзеля грамадства, дзеля СВАБОДЫ. Каб несці з сабой Вецер Свабоды і вызваляць іншых птушак. І рабіць рэчаіснасць лепшай з кожным свабодным крокам.

Каб быць вольным… ЧАЛАВЕКАМ!!!

Хто я?

Я — СВАБОДА.

А хто ТЫ?

Чаго прагнеш ТЫ?

Хочаш спаткацца са мной? Выйдзі на прастор Беларусі. Паглядзі на блакітнае неба. Глыбока ўздыхні. Заплюшчы вочы. Уяві сябе птушкай. Азірніся навокал. Паглядзі на прыгажосць зямлі тваіх продкаў. Ты — жыхар краіны пад белымі крыламі бусла. Ты вольны, як ён. Бо ты — беларус.

# СТОЙЦЕ Ў СВАБОДЗЕ

**Андрэй Ніканенка**
**г. Ліда**

*Густ свабоды не зведалі. Шкода.*
*Ў рабства самі цяпер папаўзлі.*
*Няма волі — няма і народа.*
*Застанемся ці не на Зямлі?*
А. Балуценка

Кожнаму чалавеку ад нараджэння Бог дае свабоду. Значыць, Свабода ёсць натуральным правам. Свабода для кожнага чалавека — гэта асабістае права, гэта права, якое трэба захоўваць на працягу ўсяго жыцця, права, якім трэба ганарыцца.

Свабода, воля… Гэтыя словы неяк па-асабліваму ўспрымаюцца. Што ж на самай справе гэта такое? У некаторых, напэўна, пры слове «свабода» ўзнікае ўяўленне нейкага шырокага светлага прастору, дзе вее цёплы лагодны вецер. Несвабода звязана з нечым замкнёным, прыгнечаным і абмежаваным. Давайце паразважаем: свабода — гэта калі мы можам рабіць усё, што пажадаем? З аднаго боку так. Але ўсе нашы дзеянні павінны быць накіраваны менавіта на дабро. Прычым нельга думаць толькі пра сябе, бо такая свабода ператвараецца ў зло. Як казаў Папа Ян Павел II: «Свабода — гэта значыць рабіць правільна».

Напрыклад, многія людзі ў розных краінах патрабуюць легалізацыі наркотыкаў, прастытуцыі, абортаў і г. д. Гэта, на маю думку, свабода зла. А чаму не можа быць свабоды зла? Вядома, што Бог даў свабоду Сатане, але на пэўны час. Пакуль колькасць паўшых анёлаў не заменіцца адпаведнай колькасцю справядлівых людзей. У гэтым і ёсць сэнс духоўнай гісторыі чалавецтва і змест барацьбы дабра са злом на Зямлі. Проста трэба помніць, што існуюць сапраўдныя маральныя каштоўнасці. Трэба выконваць тыя 10 запаветаў, якія пакінуў нам Бог. Толькі тыя людзі, той народ, які выконвае запаветы Хрыста, можа жыць сапраўды шчасліва, свабодна… Таму трэба заўсёды помніць словы Апостала Паўла: «Дык стойце ж у свабодзе, якую даў вам Хрыстос, і не схіляйцеся зноў пад ярмо рабства».

Давайце паразважаем, у чым заключаецца свабода для жыхара сучаснай Беларусі. На мой погляд, прынцып свабоды ў нашай краіне цесна ўзаемазвязаны з духоўным развіццём грамадства. Безумоўна, на выхаванне не аднаго пакалення паўплывала 70 гадоў камунізму. Гэты час нагадвае грамадства, якое апісаў Олдас Хакслі ў яго рамане «Гэты новы цудоўны свет». У грамадстве Хакслі няма патрэбы ў рэпрэсіях, бо кожны думае, што існае грамадства — цудоўнае. Кожны перакананы, што ён шчаслівы і што становішча, якое ён мае, — найлепшае. Таму свабода ў беларускім грамадстве з’яўляецца

не каштоўнасцю, а выбарам. Выбарам паміж чым? А тым, што найвялікшымі каштоўнасцямі з'яўляюцца Бог, жыццё чалавека і жыццё народа. Там, дзе свабода ўступае ў канфлікт з гэтымі каштоўнасцямі, робіцца выбар. Ён можа быць розным.

А ў чым свабода для чалавека, які стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій, — Мікалая Уладзіміравіча Бельскага?

Мікалай Уладзіміравіч — беларус, жыў у таталітарнай краіне, дзе кожны дзень кіраўніцтва насаджала страх у народзе, страх перад свабодай. У 1952 годзе гаспадарка яго бацькі была прызнана кулацкай, а ён як член кулацкай сям'і быў сасланы ў Казахстан, дзе правёў 4 гады. Пасля вызвалення свабоды ён не адчуў, бо атрымаў толькі дазвол на перамяшчэнне, пры гэтым не мог жыць у Маскве, Ленінградзе і ў сваёй вобласці. Нягледзячы на гэта, Мікалай Уладзіміравіч прагне свабоды і сёння. Ён захапляецца моладдзю, якая адстойвае сваю свабоду, свае правы.

«Трэба змагацца, пакуль усе не зразумеюць, што трэба жыць лепш...» — разважае Мікалай Уладзіміравіч. Гэтыя словы сугучныя словам Франкліна Рузвельта: «Сапраўдная свабода не можа быць падараваная, яе трэба дасягнуць».

Усё ж нейкі час таму наш народ мусіў засвоіць, што палітычная свабода, свабода слова і іншыя правы чалавека з'яўляюцца тым, за што трэба змагацца. Але, здаецца, сёння для многіх гэта забытыя веды. Мы шчаслівыя. Няма вайны. А таму пра што і навошта клапаціцца?

Калі мы пастаянна не змагаемся за права быць свабоднымі, гэтае права будзе ў нас адабрана. Прыкладам з'яўляюцца развагі знакамітага лютэранскага святара часоў нацызму Марціна Німёлера: «Спачатку яны арыштоўвалі камуністаў, і я не пратэставаў, бо я не камуніст. Затым пачалі чыніць гвалт з габрэяў, і я нічога не казаў, бо не габрэй. Потым прыйшлі арыштоўваць каталікоў, але што мне з таго: я ж не каталік. А калі яны прыйшлі па мяне, дык вось жа нікога і не засталося, каб заступіцца за мяне».

У нас, беларусаў, было шмат шляхоў да свабоды, шмат змагароў за свабоду. Асноўнай задачай было тое, каб пазбавіцца ад каланіяльнага прамаскоўскага рэжыму, каб спыніць агрэсію расейскай палітыкі і гарантаваць бяспеку дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі. Усё правільна. Але трэба змагацца разам. Толькі калі нас шмат, толькі калі мы ўсе разам, мы пераможам. Таму трэба пачынаць з самога сябе. Трэба змяніць сябе, сваіх сяброў, тых, хто вакол цябе. А сябры зменяць сваіх сяброў і г. д. Глядзіш, а нас ужо і шмат. Толькі тады мы пераможам! Мы здабудзем сабе чаканую столькі гадоў Святую Свабоду і ўжо больш ніколі не кінем яе ў бруд.

## НАША ГАЛОЎНАЯ МЭТА

**Аляксандр Пагарэлаў**
**Пухавіцкі раён, в. Ліпск**

На маё разуменне, свабода ў грамадстве — гэта свабода друку, слова, веравызнання, свабода выбару. Але, на вялікі жаль, у нашым грамадстве гэтага няма, бо друк, радыё, тэлебачанне — маёмасць прэзідэнта, а не народа. Вось таму народ не ведае, што на самай справе адбываецца ў грамадстве, а ведае толькі тое, што яму паказвае тэлебачанне. А калі ж казаць пра свабоду выбару, дык і тут таксама ніякай свабоды няма, бо цяпер кандыдатам нельга сказаць нічога праўдзівага, інакш яны, як мноства іншых, будуць пераследавацца ўладай як здраднікі. Таксама калі казаць пра свабоду ў грамадстве, нельга не падкрэсліць той факт, што шмат чыноўнікаў, якіх паставіла ўлада, — не патрэбныя, а толькі разводзяць бюракратыю і карупцыю. На самай справе ў нашым грамадстве няма ніякай свабоды, бо ўсё забаронена ўладай і трэба рабіць толькі тое, што кажа ўлада.

Такім чынам, стварэнне свабоднага грамадства — наша самая галоўная мэта, а таксама мэта нашых дзяцей і ўнукаў.

## ПАСЛУХАЙ ПЕСНЮ ВЕТРУ

**Наталля Сябрук**
**г. Мінск**

Шкада, што сучаснаму чалавеку цяжка знайсці дакладнае вызначэнне тэрміна «свабода». Можа, калі б было менш інтэрпрэтацый, меркаванні абывацеля не зводзіліся б да таго, што «гэта калі ўсё дазволена»? Можа, у сваіх разважаннях пра свабоду мы мудрагелістымі словамі малюем непатрэбны пафас? Аддаём даніну інтэлектуальнай модзе? Чалавек навучыўся хаваць пачуццё за словамі.

Якая-небудзь нацыянальнасць «N» успрымае свабоду як належнае. Для беларуса — гэта фактар прыроджанай прагі. Ні нашы продкі, ні мы не нарадзіліся з усведамленнем таго, што мы — свабодныя. Свабода заўсёды асацыявалася з барацьбой. І мы змагаемся і будзем за яе змагацца. Таму што гэта не скрынка ў прыгожай абгортцы, якую даруюць на свята. Гэта веды, якія прыходзяць з цягам часу, гэта згуртаванне нацыі, рухальны рэсурс, дарога да праўды, важкая частка дэмакратыі, да якой чалавецтва імкнецца ісці гуманнымі шляхамі. Няма чалавека, які быў бы абыякавы да лёсу сваёй краіны. Малыя і старыя, бедныя і багатыя прымаюць удзел у пабудове жыцця роднага краю.

Маладзёжны рух працягвае набіраць абароты. І гэта не таму, што зараз модна быць «супраць», а таму, што «next generation» навучылася ўспрымаць навакольны свет праз прызму ўласнага нораву, разумець, дзе паволі, а дзе рэзка…

Сярод нас ёсць людзі, якія не баяцца глядзець праўдзе ў вочы, не баяцца таго, што «вертыкаль» глядзіць на іх як на сацыяльна небяспечных элементаў. Але ж такіх «элементаў» нямала, і яны ўсё крочаць і крочаць ад хаты да хаты, «гнуць» сваю лінію. І шмат такіх сярод нашых суседзяў, знаёмых ці родных. Засталося толькі расплюшчыць вочы і пазнаць адзін аднаго.

Ромка Усцінаў навучаецца на палітолага ў адным са сталічных інстытутаў. Разумны хлапец са сваімі інтарэсамі ды поглядамі на жыццё прыехаў у Мінск, каб адкрыць для сябе новыя магчымасці. Але ці лёс, ці, можа, нехта іншы падрыхтаваў для яго не самы салодкі кавалак пірага. Ён і не здагадваўся, што ўвесну-2006 яго знаходжанне на планеце зменіць некаторыя ракурсы, што прага свабоды зменіць дынаміку яго жыцця. 21 сакавіка ён запомніць як свой першы арышт. Дзень, калі магічны ключык адчыніў дзверы з таблічкай: «Асцярожна, праблемы». Ці за гэта ён змагаўся, калі нёс жыццёва важныя калорыі на Кастрычніцкую плошчу, калі дзяліўся ўражаннямі з аднадумцамі? Гэта быў заклік сэрца, хаця, магчыма, і розуму, а можа, і ўвогуле сінкрэтызм, своеасаблівы альянс пачуццяў. Усю працу ацанілі ў дзесяць сутак. Няшмат, але на першы раз хопіць.

Сёння яго прысутнасць на лекцыях чаргуецца не з перапынкамі, а з «пуцёўкай» у дэканат. Тлумачальная запіска — як самастойная праца. На пытанне: «Ты куды пасля пары?» — ён іранічна ўсміхаецца. Адказ зразумелы без слоў. Справядлівыя выкладчыкі паціскаюць плячыма, маўляў, усё разумеюць, але «палітычных» сказалі не выганяць, такім чынам… «Такім чынам, не здаць табе, Ромка Усцінаў, экзамены. Будзеш, выдатнік, выключаны за «непаспяховасць!»» А як яшчэ змагацца з «чорнымі плямамі?» Выходзіць, своеасаблівая «зачыстка». Жанчыны нараджаюць дзяцей не для таго, каб яны некага зачышчалі, і тым больш не для таго, каб яны аказаліся гэтымі «плямамі».

Моц чалавечага розуму — у магчымасці сумнявацца. І часта замест кнопкі «keep out» уключаецца «keep on». Але ж калі пачаў нешта, трэба даводзіць да канца, трэба ісці наперад, бо стаяць на месцы — тое ж самае, што рухацца назад.

Самае цікавае ў тым, што Ромка не адзіны, хто не пабаяўся зрабіць крок на гэтым цярністым шляху. Сотні актывістаў, аднадумцаў, змагароў за праўду, аматараў і прафесіяналаў моцнаю сеткаю падпіраюць свет знізу. І якія б перашкоды ні траплялiся на дарогах, людзі маюць свой лозунг, свой сцяг, свой розум. Я за свабоду тады, калі навучуся быць унутрана свабоднай. Мы паспелі — значыць сэрца ў нас?

# «АДЗІНАЙ МЭТЫ НЕ ЗРАКУСЯ»: ШТРЫХІ ДА БЕЛАРУСКАГА ЖАНОЧАГА ДУХУ СВЯТОЙ СВАБОДЫ

**Вольга Палуйчык**
**г. Гродна**

*Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай*
*Краіну нашу і наш народ!*
Наталля Арсеннева

Лёс асобнага чалавека складае лёс усяго яго народа. «Кожная краіна, — сцвярджае М. Рэрых, — пры сэрцы сваім шануе імёны, якія вядуць яе да Святла». Для Беларусі такім святлом была і ёсць ідэя свабоды, асабістай і грамадскай, кожнага чалавека і ўсёй нацыі. А імёны тых, хто сваёй прагай да яе пакінуў след у гісторыі народа, становяцца яго сімваламі.

Але ці настолькі кансерватыўнае і патрыярхальнае наша грамадства, што са здзіўленнем успрымае жаночую прагу да свабоды, хаця жанчыны на працягу ўсяе беларускай гісторыі побач і нараўне з мужчынамі стаяць у шэрагах змагароў за волю?

## Полацкая зямля як крыніца жаночай ідэі волі

«Не хачу разуці рабычыча, за Яраполка хачу», — свабода выбару полацкай князёўны Рагнеды, безумоўна, не была першай спробай прыняцця самастойнага жаночага рашэння ў беларускай гісторыі. Аднак гэта сведчыць ужо пра спробу прызнання згоды жанчыны на шлюб у сярэднявеччы (раней яна была таварам), што дазволіла пазбегнуць значнага абмежавання яе свабоды. Праўда, «наступствы» выбару Рагнеды вядомыя: забойства родных, гвалтоўны шлюб і доля кінутай каханкі. Каханкі… Каб кахаць, трэба адчуваць сябе свабодным. Па словах гісторыка У. Арлова, Рагнеда не скарылася з тым, што дзеля паўнаты ўлады Уладзімір забіў яе бацькоў і братоў. Замах на жыццё мужа вырашыць лёс будучай свабодалюбівай манашкі, а імя Рагнеды зойме асаблівае месца ў беларускай свядомасці і стане асацыявацца з годнасцю, няскоранасцю і нялёгкім лёсам Беларусі.

Не менш знакавая асоба для гэтага часу — Еўфрасіння Полацкая, якая стала пачынальніцай магутнай плыні асветніцкага кніжнага слова. Дзякуючы яе намаганням быў закладзены падмурак першых інстытутаў абароны правоў чалавека, палітычнай дыпламатыі і культурна-асветніцкіх цэнтраў, «дзе і пачалося фарміраванне асноў Незалежнасці, яе філасофіі і этыкі» (В. Коўтун). З’яўляючыся змагаркай за свабоду, абаронцай пакрыўджаных і бедных, Еўфрасіння адна з першых жанчын-палітыкаў была міратворцай і спыняла братазабойчыя войны. Імя святой Еўфрасінні По-

лацкай сімвалізуе сабой не толькі ўздым, росквіт культуры, але і маральна-этычныя ідэалы, якія яна бачыла ў служэнні Богу, што дае свабоду душы, народу і Радзіме.

## Жаночая эмансіпацыя ў эпоху Адраджэння і Асветніцтва

У грамадскім развіцці XVI стагоддзя была дасягнута новая прыступка — эпоха Адраджэння. Час росквіту Вялікага княства Літоўскага стварыў культурныя каштоўнасці, якія адлюстроўвалі ролю жыцця грамадства і ролю жанчыны ў ім. Асаблівае значэнне належыць Статутам ВКЛ, дзе былі сфармуляваны першыя жаночыя правы, што стала прычынай з'яўлення новага тыпу жанчыны: разняволенай і свабодалюбівай. Вядомыя прыклады вайсковай дзейнасці жанчын, якія арганізоўвалі наезды на суседзяў, асабіста камандуючы конніцай і пяхотай. Важным сведчаннем эмансіпацыі жанчыны з'явіўся іх актыўны ўдзел у судовых працэсах, дзе яны самі абаранялі сябе, добра ведаючы заканадаўства і не карыстаючыся дапамогай адваката. Аднак, гэта зусім не сведчыць пра ўсеагульную свабоду жанчын.

<…>

Да гэтага часу свабода жанчыны асацыявалася з нейкай унутранай незалежнасцю, прыватным правам выбару, правам «чалавекам звацца», захоўваючы сваю годнасць, самабытнасць, вартасць як асобы, правам засцерагчы свой сямейны лад, які таксама не выходзіць па-за межы прыватных жаданняў чалавека. Але паступова беларускія патрыятычныя ідэі XIX стагоддзя ўваходзяць у жыццё кожнага чалавека. І жанчына становіцца грамадзянкай.

## Як жыць — дык жыць для Беларусі

Усведамленне беларускім народам сваёй самабытнасці спрыяла развіццю нацыянальна-вызваленчых ідэй. Палымяны заклік Кастуся Каліноўскага да змагання «за свайго Бога, за сваё права… за сваю бацькаўшчыну» збіраў у адданыя паплечнікі і жанчын: Алена Скірмунт, Марыя Багушэвіч, Каміла Марцінкевіч… Апошняя, Каміла, любімая дачка Вінцэнта Дуніна Марцінкевіча, яшчэ перад паўстаннем 1863 года вядома была сваімі антыўрадавымі поглядамі, а ў час паўстання арганізоўвала «беспарадкі» ў Мінску і яго ваколіцах. У Варшаве вывела цэлую «песенную» дэманстрацыю жанчын у нацыянальных строях.

Так сустракала знявечаная і спакутаваная ў пошуках волі Беларусь пачатак XX стагоддзя. Сімвал «тутэйшасці», нібы кляймо, прыніжаў народ, і з ім пачала змагацца беларуская жанчына. «… Хто гаворыць па-тутэйшаму, па-мужыцку, значыцца, ён гаворыць па-беларуску, а хто гаворыць па-беларуску, той беларус», — такія высновы зрабіла ў прадмове да зборніка «Скрыпка беларуская» пачынальніца масавага жаночага руху Цётка (Алаіза Пашкевіч). Ідэя вызвалення беларуса перарастае ў вызваленне ўсёй беларускай нацыі, ствараючы новы ідэал, арыентаваны на нацыянальныя каш-

тоўнасці: мову, культуру, гісторыю. Побач з Цёткай у шэрагу змагароў стаяць Зоська Верас, Палута Бадунова, Паўліна Мядзёлка, Казіміра Яноўская, Канстанцыя Буйло, якія мелі актыўную палітычную і грамадзянскую пазіцыю і адыгралі велізарную ролю ў абуджэнні народнай свядомасці ў імя свабоды.

Нельга прадставіць беларускую жаночую патрыятычную плынь і без Ларысы Геніюш, дом у Зэльве якой заўсёды быў асяродкам згуртавання нацыянальнай інтэлігенцыі. Па-сапраўднаму аддадзенай беларускай яна паўстае ў сваіх вершах з падпольнай канцлагернай перапісцы, адкуль з радка ў радок цвёрда і мужна крочыць воля:

*Толькі б мець непахісную волю,*
*магутнейшую волю за зьдзек…*
*Не трывожся няроўнасьцю бою,*
*што адна супраць цемры стаю,*
*што мне душу атрутаю пояць,*
*я жа знаю — за што яе пяю…*

Свабода… Горка-салодкі водар. Горкі — бо шмат нягод трэба перажыць, каб адчуць салодкую волю, выпешчаную слязьмі, пакутамі, горам жанчын… Выпешчаную… Як маці гадуе дзіця, так і мы, нашчадкі Рагнеды і Еўфрасінні, Камілы Марцінкевіч і Палуты Бадуновай, Цёткі і Ларысы Геніюш. Ды так, каб стаць у шэрагі змагароў са славутымі папярэдніцамі за наша беларускае шчасце, за нашу беларускую вольнасць.

Беларусь мая… Шматпакутная… Колькі чужых грудзей хацела дыхаць тваім паветрам, якое кіпела ад прагі волі. Не проста кіпела ад прагі свабоды, а гэты кіпень выліваўся і жорстка апальваў тых, хто хацеў рабаваць роднае, вольнае…

Ніколі не перастане бурліць гэты кіпень, пакуль у свядомасці чалавека ёсць адчуванне свабоды, ніколі не згінуць нацыі, якія трымаюцца на трох кітах: моцных жаночых і магутных мужчынскіх плячах і канцэптуальнай ідэі свабоды як «найбольшай маральна-фізічнай каштоўнасці, дадзенай кожнай жывой істоце фактам яе нараджэння» (Васіль Быкаў).

Адзінай мэты не зракуся!

# НАШЫ ЗЕМЛЯКІ — ЗМАГАРЫ ЗА СВАБОДУ

**Кацярына Пятроўская**
**г. Міёры**

*... Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай*
*Краіну нашу і наш народ!*
Наталля Арсеннева

Кожны чалавек па-рознаму разумее свабоду. У школьным падручніку «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» для X класа прыведзена шмат разважанняў, чым ёсць свабода. Сваю асабістую свабоду я бачу са сваёй краінай — сапраўды вольнай і незалежнай, дзе свабодна гучыць наша родная беларуская мова, дзе паважаецца наша культура, наша гісторыя і наша гістарычная спадчына. Толькі ў сапраўды свабоднай краіне я змагу здзейсніць свае задумы і мары. За гэта трэба змагацца, і дух нашых продкаў, маіх славутых землякоў Міёрскага краю, павінен натхняць нас. Іх жыццё і дзейнасць не згасне ў гісторыі. Вось толькі некаторыя радкі біяграфій нашых землякоў — актыўных змагароў за свабоду.

Імя Генрыха Дмахоўскага — самаадданага рэвалюцыянера, палітычнага дзеяча і таленавітага скульптара XIX ст. — вядома ўсяму свету. Пра яго жыццё напісаны дзесяткі кніг і артыкулаў на рускай, польскай, англійскай, французскай і іншых мовах. Усё яго жыццё было прысвечана барацьбе за свабоду не толькі нашага беларускага, але і польскага, літоўскага, фінскага і іншых народаў.

Генрых Дмахоўскі нарадзіўся 14 кастрычніка 1810 г. у сям'і ўладальніка маёнтка Забалоцце Дзісенскага ўезда Міхаіла Дмахоўскага. Бацька хацеў даць сыну добрую адукацыю і належнае выхаванне. Генрых вывучае права ў Віленскім універсітэце і авалодвае майстэрствам скульптара.

Але выбухнула паўстанне 1831 г., і Дмахоўскі цалкам аддае сябе барацьбе за вызваленне з-пад улады рускага цара. Пасля разгрому паўстання Генрыху цудам удалося ўцячы, і ваенны трыбунал асудзіў яго завочна. Каб пазбегнуць кары, юнаку ў 21 год прыйшлося эміграваць. Але і ў эміграцыі ён не губляе надзеі вярнуцца ў Беларусь і працягваць барацьбу.

Генрых Дмахоўскі памяняў сваё прозвішча, зрабіўся Эмерыкам Сандэрсам. У 1846 г. ён уступае ў рады польскага дэмакратычнага таварыства, якое стаіць на рэвалюцыйных і дэмакратычных пазіцыях.

Рэвалюцыі 1848–1849 гг. абудзілі народы Еўропы. Дмахоўскі зноў у першых радах змагароў за свабоду і незалежнасць, цяжка паранены пры абароне Львова. Апынуўшыся ў Францыі, ён удзельнічае ў стварэнні камітэта па вызваленні Фінляндыі. Потым у ЗША займаецца творчай дзейнасцю як

скульптар. Стварае помнікі Касцюшку, Вашынгтону, Джэферсану. Але калі на радзіме пачалася падрыхтоўка паўстання, ён абірае не ўласны дабрабыт, а свабоду свайго народа. Стварае ў нашых мясцінах паўстанцкі атрад і гіне ў барацьбе за волю ў 1863 годзе.

Пётр Васільевіч Мятла нарадзіўся ў 1890 годзе ў сям'і заможнага селяніна Васіля Усцінавіча Мятлы. Ён закончыў царкоўна-прыходскую школу ў роднай вёсцы, затым гімназію ў Дзісне, педагагічныя курсы ў Коўне. У 22 гады малады настаўнік пачаў сваю педагагічную дзейнасць.

Пётр Мятла быў абраны дэпутатам польскага Сойму. На мітынгу ў мястэчку Дунілавічы 3 красавіка 1926 г. ён заклікае працоўных актыўна змагацца за атрыманне зямлі без выкупу, за перанос падаткаў на заможных, за змяншэнне войска і паліцыі, ліквідацыю беспрацоўя, амністыю для палітзняволеных, адкрыццё нацыянальных школ. А 5 снежня 1926 г. Мятла, нягледзячы на дэпутацкую недатыкальнасць, быў збіты паліцэйскімі пры разгоне з'езда Грамады Бельскага павета, які праходзіў у вёсцы Стара-Бярозава.

У 1928 г. Пётр Мятла і іншыя кіраўнікі Грамады былі асуджаны на 12 гадоў турэмнага зняволення, апеляцыйны суд скараціў гэты тэрмін удвая.

У 1931 г. пасля адмены зняволення ён пераязджае ў савецкі Мінск і ўсе свае сілы аддае літаратурнай і грамадскай дзейнасці. Сталінскі тэрор абарваў жыццё нашага земляка ў 1937 годзе.

<...>

Абмежаванасць аб'ёму працы не дазваляе мне спыніцца больш падрабязна на дзейнасці нашых землякоў, змагароў за свабоду беларускага народа. А такіх шмат. Аўген Аніська з вёскі Шальціны пры Польшчы выдаваў беларускі часопіс, ствараў арганізацыі беларускай гаспадаркі і культуры, пасля вайны жыў у Польшчы і там працягваў падтрымліваць беларускія арганізацыі. Чэслаў Сіповіч з Дзедзіна, будучы беларускім біскупам у Лондане, стварае бібліятэку і музей імя Ф. Скарыны. Актыўным змагаром за Беларусь быў у міжваеннай Польшчы Браніслаў Туронак родам з-пад Новага Пагоста, яго сын Юры Туронак — выдатны даследчык беларускай гісторыі, жыве зараз у Польшчы. Язэп Малецкі, атрымаўшы медыцынскую адукацыю, не толькі бясплатна лячыў бедных, але і выдаткоўваў сродкі для выдання беларускіх календароў, часопісаў.

Але прыклады барацьбы за свабоду былі не толькі ў мінулым. У Міёрах жыве адзін з кіраўнікоў створанага пасля вайны Саюза беларускіх патрыётаў — Аляксандр Іванавіч Юршэвіч. З самага першага конкурсу «Блізкай гісторыі» сябры гуртка «Арганаўты мінулага» даведаліся аб маладых патрыётах, якія пасля вайны не толькі марылі аб вольнай і незалежнай Беларусі, але не спалохаліся сталінскага тэрору, пачалі дзейнічаць на карысць свабоды.

# МЫ — «ЖМЕНЬКА ЭЛІТНАГА БЕЛАРУСКАГА ГАТУНКУ»

**Дзмітрый Сутула**
**г. Глыбокае**

*Сірочая доля ў народа без волі,*
*Вечны прыцемак з ранку да вечара.*
*Аскет ад прыгнёту, фізічны й маральны калека,*
*Баіцца народ, каб назвалі яго Чалавекам.*
*О, колькі ж цярпець, каб скрылямі не рэзалі нацыю?*
*Колькі трываць немач-страх «каранацыяў»?*
*Можа, не трэба чакаць, а ўзяцца сябе вызваляць?*
**Галіна Сутула**

Так, акравершам, пісала пра свабоду мая мама, і я далучаюся да яе голасу: трэба вызваліць сябе ад страху і жыць свабодна. Дзякуючы маме я не ведаю, што такое страх перад чалавекам, перад пасадай, перад уладай. З дзяцінства мама павучала мяне: бойся стаць злачынцам, бойся здрадзіць свайму сумленню, бойся прадаць Веру. А калі ты нічога не ўкраў, нікога не пакрыўдзіў, жывеш, не парушаючы Божых запаветаў, — баяцца няма чаго. Кажы, што думаеш, жыві так, як падказвае розум, як адчувае сэрца, імкніся не дагаджаць аднаму чалавеку, а прыносіць карысць многім людзям. Я так і жыву, і адчуваю, што маю ўласную свабоду.

Так здарылася, што, удзельнічаючы ў конкурсе «Я беларус, і тым ганаруся», я трапіў у лік пераможцаў і першы раз паехаў у Польшчу. Менавіта там, за мяжой, я адчуў, што такое быць не проста свабодным чалавекам, а свабодным беларусам. Усе мае аднагодкі, а паехала нас сорак чалавек, былі мне братамі і сёстрамі па крыві, па духу, адной сям'ёй, у якой адзіная маці і гаспадыня — Беларусь. У Польшчы мы размаўлялі, спявалі, праводзілі конкурсы толькі па-беларуску, і гэта было цудоўна!

Ніхто не казаў, што мы людзі другога гатунку. Нашы настаўнікі вучылі нас жыць, думаючы па-беларуску, і думаць, жывучы па-беларуску. За 9 дзён змаглі навучыць нас больш, чым мяне вучылі шэсць год у школе. Слодыч той свабоды не параўнаць ні з якім «Снікерсам». Я ўвесь час памятаю словы, сказаныя нам: «Вы — жменька элітнага беларускага гатунку, з якога і пачнецца адраджэнне нацыі». Гэта так ганарова і так адказна!

## Выціснуць са свайго «я» раба

Выканаць гэтую ўмову неабходна, каб быць сапраўднымі свядомымі беларусамі і «людзьмі звацца». Калі ж гаварыць у больш шырокім сэнсе, то свабоды прагнуць усе людзі на планеце, розных узростаў, веравызнанняў, нацыянальнасцяў. Прагнуць свабоды грамадзянскай, якая ўключае ў сябе

свабоду палітычную, эканамічную. Пра свабоду гаварылі, аб ёй мроілі, да яе імкнуліся, пісалі яе «партрэт» людзі ў розныя часы. Давайце прасочым шлях усведамлення чалавекам такой каштоўнасці, як свабода.

Старажытнарымскі аратар і публіцыст Цыцэрон пісаў: «Толькі ў такой дзяржаве, дзе ўлада народа найбольшая, можа быць свабода; бо больш прыемным, чым яна, не можа быць нічога, і яна, калі не роўная для ўсіх, ужо не свабода». Для Цыцэрона свабода — гэта найбольшае заваяванне народа. Па сутнасці, як і для Кастуся Каліноўскага. У сваім «Лісце з-пад шыбеніцы» ён пісаў: «Народзе, як толькі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду і свабоду, тады і ты не аставайся ззаду…» І звяртаўся да народа: «Бывай здаровы, мужыцкі народзе, Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе». Дзеля свабоды Каліноўскі ахвяраваў жыццём.

Самаахвярна ішоў на Галгофу дзеля свабоды і другі наш зямляк, шляхціц Ігнат Грынявіцкі, які зрабіў замах на рускага цара. У сваім запавеце Грынявіцкі казаў: «Імператар памрэ, а разам з ім памрэм і мы… Гэта неабходна дзеля свабоды, бо ў выніку значна пахіснецца тое, што называецца кіраваннем манархічным, неабмежаваным».

Пад свабодаю разумелі незалежнасць сваёй краіны кіраўнікі першага ўрада БНР. У трэцяй Устаўной Грамаце Рады БНР чытаем: «БНР зацвярджае ўсе тыя правы і вольнасці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай».

На працягу дзесяцігоддзяў за свабоду і незалежнасць Беларусі змагаліся і земляробы, і палітыкі, і паэты; беларусы ў Беларусі і беларусы замежжа. Іх веру ў перамогу падтрымлівалі радкі Максіма Багдановіча: «Старадаўняй Літоўскай Пагоні // Не разбіць, не спыніць, не стрымаць…»

Беларускі паэт Казімір Сваяк (святар Кастусь Стэповіч) пісаў, што нават «птушцы для шчасця вольнасці трэба». Сугучная гэтым словам «Малітва» Наталлі Арсенневай: «Магутны Божа, Ўладар Сусветаў! <…> Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай Краіну нашу і наш народ».

Свой адметны след пакінуў, змагаючыся за свабоду, шляхціц-беларус Тадэвуш Касцюшка. Змагаючыся за шчасце і незалежнасць народаў усяго свету, ён «лічыў сябе ліцвінам». Першы прэм'ер БНР, мой зямляк — глыбачанін Вацлаў Ластоўскі, расстраляны НКВД у 1938 г., у кнізе «Што трэба ведаць кожнаму беларусу» пісаў: «Мы гордыя за сваю гісторыю, бо наша гісторыя — гэта несупыннае змаганне за волю».

Другі зямляк — глыбачанін Клаўдзій Дуж-Душэўскі «зрабіў некалькі праектаў нацыянальнага сцяга і адзін з іх, бел-чырвона-белы, быў прыняты». Ён стаў колерам свабоды і сімвалам незалежнасці.

Яшчэ адзін мой зямляк, пісьменнік Кастусь Акула, які зараз жыве ў Канадзе, на Манрэальскай Сусветнай выставе 1967 г. (Экспа–67) у Дзень Беларусі 17 жніўня раскідваў лістоўкі і патрабаваў вольнасці для Беларусі: «Няхай жыве вольная Беларусь!»

«Змена прыйдзе, — пісаў ён у кнізе «Усякая ўсячына», — беларускі народ выжыў... і здабудзе сапраўдную вольнасць. Бо станецца, як сказаў паэт: яшчэ прыйдзе вясна, яшчэ прыйдзе».

Васіль Быкаў у кнізе «Крыжовы шлях» пісаў: «Чалавек — стварэнне Боскае і нараджаецца свабодным... Абсалютна справядліва: не можа быць нацыя свабоднай, калі яна знявольвае іншыя нацыі... Мы забыліся, як выглядае свабода. Нацыя з хамутом на шыі — нацыя не свабодная...» Гэтыя словы — адказ на пытанне пра свабоду ў Беларусі.

Свабода — гэта прыгажосць душы, нацыі. Менавіта так думаў паэт Славамір Адамовіч, калі даваў сваё вызначэнне гэтаму слову: «Думаю, што свабода — гэта жанчына, якая штораз мяняе сваё аблічча».

Сапраўды так. Свабода, як і дзяўчына, — загадка, таемнасць, прыгажосць, зменлівасць і жаданне.

Усе вышэйзгаданыя асобы выціснулі раба з сябе і дапамагалі вызваляцца іншым. Шлях гэты нялёгкі і няпросты. Але беларусы ўжо крочаць па ім.

### Мая свабода

Свабода для мяне — вера ў Госпада. Яна пазбаўляе страху перад чалавекам і прывучае да адказнасці за грэх супраць чалавека.

Свабода — адказнасць за свае ўчынкі, паводзіны, за сваё жыццё і яго вынікі.

Свабода — гэта незалежнасць краіны. Гэта магчымасць рабіць усё, што не забаронена законам. Свабода — права выбару ва ўсім, у тым ліку годнага жыцця. Гэта доступ да ўсебаковай інфармацыі. Рабіць выбар мяне вучыла мая мама з дзяцінства. Кожны вечар з мамай мы падводзілі вынікі пражытага дня. Мама малявала на паперы вагі. Я расказваў, што зрабіў за дзень, і мы разам аналізавалі мае ўчынкі. Добрая справа — мама малюе «абаранак» на левых вагах, дрэнная — на правых. Падлічвалі «абаранкі», і за добрыя ўчынкі мама мяне цалавала, што было прыемна, а за дрэнныя выгаворвала і павучала. Я згаджаўся, бо ўсё было справядліва. Гуляючы, мама вучыла мяне рабіць выбар паміж пацалункам і пакараннем. Зараз я ўжо падрос і самастойна кантралюю сябе. І лічу, што свабода — гэта моцны самакантроль і адказнасць. Я ўдзячны маме, што самыя першыя парасткі свабоды ў маёй свядомасці пасадзіла і ўзгадавала яна, самы лепшы, добры і разумны чалавек.

У другім класе, памятаю, я прачытаў казку пра дзвюх жабак, якія ўваліліся ў збанок са смятанай. Адна спужалася, не паверыла ў свае сілы, склала лапкі і пайшла на дно. А другая цялёпкалася, намагалася вылезці. Збіла смятану лапкамі ў масла і выскачыла на волю. У абедзвюх было права на выбар. Абедзве зрабілі яго. Я ўпэўнены, што свабоду нам ніхто не паднясе на талерачцы. Да свабоды трэба імкнуцца, яе трэба жадаць, змагацца за яе, марыць, як марым мы пра бацькаўшчыну на чужыне.

## Беларуская свабода за кратамі

Сонца свеціць для ўсіх, а свабоду выдае ўлада, як лекі, па чайнай лыжачцы, толькі тым, хто яе падтрымлівае. Хто думае не так, як улада, хто паводзіць сябе не так, як яна, той знікае з жыцця, губляецца ў невядомасці, асядае за кратамі, робіцца «ворагам народа».

«Сонца вісіць на небасхіле, як дэкарацыя: свяціць — свеціць, але не грэе. Гэтак і прамоўца таўчэцца ля мікрафона — жывая дэкарацыя: гаварыць — гаворыць, але няпраўду, якая таксама не цешыць і не грэе...»

У нас няма свабоды слова і друку. Тым, хто хоча сказаць праўду, «зашываюць рот»: яны пазбаўляюцца працы, доступу да аўдыторыі. У нас свабода друку як перабраныя семкі: зерне схаванае, скарыстанае ўладай на сваю карысць, а шалупінне — простым смяротным.

У краіне няма свабоды беларускасці. Беларускамоўныя мерапрыемствы праводзяцца дзеля справаздачы. Уражанні аб іх правядзенні ўжо па-руску. У краіне адзінкавыя беларускамоўныя класы. Нацыянальнае тэлебачанне на рускай мове. Эстрада, як жабрачка, нішчымная на беларускія песні.

У краіне няма свабоды духу. Царква стала прыслужніцай улады. Бацюшка перад выбарамі агітуе галасаваць за «бацьку». А бацька ж у нас духоўны адзін — Госпад Бог. Забыўся святар? Загадалі, а дух яго слабы. Не загартаваны верай, не напоўнены нацыянальнай годнасцю, вось і пераламаўся, як трэсачка, пад загадам.

Асабіста для мяне нічога няма даражэй за свабоду. Калі не будзе яе, заўтра я магу страціць дарагіх мне людзей, маіх бацькоў, сяброў, аднадумцаў. Як? А ўлада скажа, што яны здраднікі, бо яе не падтрымліваюць, а таму заслугоўваюць турмы. Будзе свабода — я не дапушчу гэтага, змагу абараніць іх. Не будзе свабоды — і я таксама стану «ворагам».

Пакуль я вучуся ў школе, яна для мяне своеасаблівая міні-дзяржава са сваімі парадкамі. У школах трэба вучыць не баяцца ўлады, не прыніжацца перад ёй, а патрабаваць. Адстойваць сваё права, не маўчаць пакорліва. Зараз у школе даюцца асновы правоў дзіцяці, правоў чалавека. Настаўнік расказвае тэорыю, як павінна быць. Усё прыстойна і прыгожа. Але як толькі вучні памкнуцца паразважаць на тэму правоў чалавека ў Беларусі, чуюць пагрозлівае: «Не перашкаджайце весці ўрок». Вось і ўсё правы. У школе нам дадзена толькі адно права — быць пакорлівымі.

Мы павінны вывучаць беларускую гісторыю, а не гісторыю, прыдуманую для беларусаў, каб «забрудзіць» галаву і пасяліць у свядомасці пачуццё прыніжанасці, няўпэўненасці ў сваіх сілах ды неабходнасці правадыра.

Размаўляць, думаць, дзейнічаць мы павінны згодна нашым традыцыям, па-беларуску, а не з беларускім акцэнтам. Адзінай ідэалогіяй павінна быць ідэалогія розуму.

Выхоўваць патрыятызм трэба не ў спецыяльна падабраных групах моладзі тыпу БРСМ, не надзяляць іх ільготамі, не ствараць «парніковыя» ўмовы для жыцця, а ва ўсім моладзевым асяродку. Выхаванне патрыятызму буду-

чага пакалення павінна быць мэтанакіраванай нацыянальнай праграмай. Але нельга стаць патрыётам у краіне, дзе на працягу дванаццаці апошніх год улада сцвярджае: «Будзем будаваць квітнеючую Беларусь». Патрэбны канкрэтныя справы, канкрэтны прыклад, канкрэтныя вынікі. Мае бацькі пабудавалі хату за тры гады, а Беларусь яшчэ толькі «будуць» будаваць. А што рабіла ўлада столькі год?

Я яшчэ падлетак. Люблю пабегаць, пагуляць. Люблю прыволле, раздолле, і цяжка трываць у цесным, як клетка, пакоі. Я — за свабоду, бо яна — і прыволле, і раздолле.

<...>

## ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ СВАБОДЗЕ

**Аляксандр Філічонак**
**г. Мінск**

...Ёсць шмат прычын, якія абмяжоўваюць нашу свабоду. Гэта наша канстытуцыя, крымінальны кодэкс і маральныя нормы. А калі паразважаць, ці можна назваць нашу свабоду сапраўды свабодай, калі на шляху яе стаіць мноства перашкод? На гэту тэму вельмі добра сказаў нямецкі паэт і журналіст Маціас Клаўдзіўс, як жыў у XVIII стагоддзі: «Свабода змяшчаецца ў праве рабіць усё, што не шкодзіць іншым». І гэта так, бо калі адзін чалавек будзе рабіць усё, што яму пажадаецца, то калі-небудзь яго дзеянні закрануць свабоды другіх людзей. Прыкладам гэтых слоў можа быць крадзеж. Злодзей робіць свабодны учынак у адносінах да сябе, а для іншых — гэта шкода, здрада. Вось ад гэтых учынкаў абараняюць законы, якія караюць злодзея. Гэта справядліва. А што датычыцца маральных нормаў? Усе ведаюць, што за іх парушэнне ў турму ніхто не пасадзіць і яны нідзе не запісаны, а знаходзяцца ў душы кожнага сумленнага чалавека. Ну які нармальны чалавек можа прыйсці, скажам, на працу без адзежы? Ніякі. Яго спыняць маральныя нормы.

Але не толькі законы перашкаджаюць нашай свабодзе. Ёсць яшчэ шмат фактараў, якія не даюць свабодна ўздыхнуць. Па-першае, гэта наш урад. Чаму за выказаную ўслых думку, якая адрозніваецца ад палітыкі ўрада, людзей пазбаўляюць свабоды? Чаму ўрадавае тэлебачанне прапагандуе свае аднабаковыя палітычныя праграмы, нават замест рускіх перадач? Аднак скрозь і ўсюды называюць нашу краіну «дэмакратычнай дзяржавай». Другое — вось прыклад з жыцця нашага каледжа. Адзін з выкладчыкаў мне забараняе насіць доўгія валасы. Але ж я паступіў у каледж, а не ў ваеннае вучылішча! Навошта ён мне за гэта адзнакі зніжае? Я лічу: галоўнае тое, што ў галаве, а не на галаве.

У заключэнне жадаю сказаць. Пакуль будзе існаваць свабода ў свеце, будуць існаваць людзі, якія пажадаюць забраць гэту свабоду. Беражыце,

абараняйце свабоду, яна нам дадзена з маленства да самай смерці. Але яе так лёгка страціць…

## МАЁ РАЗУМЕННЕ СВАБОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ

**Антон Чыгілейчык**
**г. Мінск**

Свабода — адна з каштоўнасцяў, сутнасць якой нельга выказаць сцісла, бо свабода — гэта паняцце шматграннае, якое ўтрымлівае ў сабе не толькі павярхоўныя тлумачэнні, але і розныя веды, складаныя працэсы, якія варта разглядаць і паасобку, і ва ўзаемадзеянні.

Што першае прыходзіць у галаву, калі вы чуеце слова «свабода», якія асацыяцыі яно выклікае? Калі не паглыбляцца ў сэнс паняцця, то для большасці свабода ёсць адсутнасць няволі, гэта значыць такі стан, калі няма ніякіх рэгулятараў стрымання. Аднак я лічу, што дадзенае меркаванне можна параўнаць з вядомай прытчай, паводле якой у трох чалавек, якія везлі тачку з камянямі, запыталі, што яны робяць. У выніку атрымалі тры абсалютна розныя адказы. Першы сказаў, што цягне калёсы з камянямі. Другі — што вязе камяні на пабудову хаты. А трэці адказаў: «Храм узводжу». Так і свабода розная для ўсіх.

Для мяне свабода — гэта комплекснае паняцце, якое ўключае не толькі фізічную і душэўную свабоду, але і стан, калі такая свабода можа быць абаронена мною. Я паспрабую разгледзець кожнае з трох пазначаных мною складнікоў, спачатку паасобку, а затым і ў комплексе.

Фізічная свабода — найбольш простае разуменне свабоды. Яно ўзнікае, калі ніхто і нішто, ніякія сілы не прымушаюць мяне да выканання якіх-небудзь дзеянняў альбо не ўтрымліваюць ад выканання такіх дзеянняў. Натуральна, яшчэ і калі я нідзе не ўтрымліваюся супраць сваёй волі. Аднак варта не толькі памятаць, але і разумець, што свабоду (не толькі фізічную, але і ўвогуле) нельга ставіць вышэй законных (у шырокім разуменні гэтага слова) інтарэсаў іншых асоб. Бо, парушаючы свабоды іншых, парушаеш сваю асабістую свабоду ў той меры, што, парушаючы агульныя правілы, даеш падставу іншым асобам парушыць тыя ж самыя правілы ў дачыненні да цябе самога.

Душэўная свабода. Гэта найбольш складанае з усіх складнікоў свабоды, бо ўключае філасофскі, этычны, прававы і іншыя сэнсы. На жаль, падрабязна разгледзець іх усе немагчыма, ды я і не стаўлю ў гэтай працы такую задачу, але для прыкладу ўсё ж паспрабую разгледзець некаторыя. Пачну са свабоды сумлення. Кожны сам вырашае, ці варта яму верыць у якую-небудзь боскасць, чароўныя або іншыя сілы, выбіраць сферу і прадмет свайго веравання. Са свабодай сумлення непарыўна звязана свабода волевыяўлення, бо

без магчымасці выказаць сваю волю свабода сумлення не можа існаваць. Аднак свабоду волевыяўлення нельга разглядаць толькі як дапаўняльны элемент, бо яна выяўляецца і ў выражэнні сваёй волі, скажам, адносна змен, якія адбываюцца ў грамадстве, дзяржаве. Вось чаму канстытуцыі ўсіх дэмакратычных дзяржаў замацоўваюць магчымасць палітычнага волевыяўлення сваіх грамадзян, даюць ім магчымасць выказаць сваю волю шляхам правядзення маніфестацый, мітынгаў і інш. Прычым такія дзяржавы можна назваць дэмакратычнымі толькі ў тым выпадку, калі грамадзяне на справе валодаюць такімі правамі, калі адсутнічае адказнасць за удзел у такіх мерапрыемствах. Грош — вось кошт дзяржаве, якая толькі дэкларуе сябе як дэмакратычная, але не дазваляе свайму грамадству выявіць сваю волю. Грош — вось кошт дзяржаве, якая, парушаючы правы і свабоды, пераследуе свой народ.

Трэцяя частка — стан, калі я магу абараніць сваю свабоду — гаворыць сам за сябе. Я думаю, няма сэнсу займацца апісаннем такога стану, бо гэта вынікае з папярэдніх тэзісаў.

Усе гэтыя тры элементы цесна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, бо пры адсутнасці хоць аднаго з іх губляецца агульная прысутнасць свабоды, тады чалавек трапляе ў несвабодны стан, што недапушчальна ў здаровым грамадстве.

Для мяне свабода заўсёды была і застанецца адным з найважнейшых складнікоў для стабільнага і належнага жыцця…

## ВЕЦЕР СВАБОДЫ

**Карына Шынкарова**
**г. Віцебск**

Па цёмным месячным небе Беларусі несліся атрады коннікаў. Грозныя жывёлы цяжка хрыпелі і рваліся наперад. Бел-чырвона-белыя сцягі луналі ў паветры. Яркім срэбрам ззяла зброя… Продкі не сцярпелі…

Я бачыла іх, і паступова шчасце гарачай хваляй напаўняла маё сэрца. Я зразумела: прыйшла дапамога! Трэба ўсім расказаць… Але не паспела, таму што прачнулася…

Я не веру ў сны. Але можа, праўда, нешта зменіцца і павее на нас ветрам свабоды?..

Той, хто хоць калі-небудзь марыў лётаць, ведае, што значыць быць свабодным. Але, на жаль, ёсць тыя, каму лепей быць у кайданах ды толькі б сытымі і нябітымі. Чаму? Што гэта? Жах або неразумнасць? Мабыць, усё разам. Няўжо чалавек ужо нараджаецца са схільнасцю да свабоды ці няволі? Або на яго ўплывае навакольнае асяроддзе?

Як казаў вядомы паэт: «І раб, стаміўшысь ад свабоды, зноў патрабуе ланцугоў!»

Сумна гучаць гэтыя словы: «Я не разумею, няўжо ад свабоды можна стаміцца?»

Калі назіраю за паводзінамі некаторых беларусаў, бачу моцнае пачуццё абыякавасці амаль да ўсяго. Тады мне згадваюцца такія пытанні: ці маем мы права на свабоду? ці маем права на родны сцяг? ці ведаем сваю мінуўшчыну? ці захоўваем вернасць роднай мове і традыцыям прадзедаў?

Ад магчымых адказаў на сэрцы робіцца трывожна.

Нашыя продкі ведалі кошт вольнасці. Яны змагаліся! А цяпер… Што здарылася? Чаму мы страцілі пачуццё сваёй незалежнасці, індывідуальнасці? Хіба нам прыемна быць марыянеткамі? Не, намі не трэба рухаць, мы самі ўмеем хадзіць! Але, на жаль, я заўважаю ўсе часцей, што большасць з нас не можа ні хадзіць самастойна, ні нават гаварыць.

Таму не шукайце вінаватых…

Уявіце сабе птушку, якую адпусцілі на волю, а яна спалохалася прастору і зноў вярнулася ў клетку. Ад такіх прыкладаў робіцца жудасна.

У нашым грамадстве адбываецца нешта незразумелае. Як, напрыклад, мне растлумачыць, што мой родны дзядзька арыштоўвае ўвесь перадвыбарчы наклад незалежнай газеты «Народная воля»? Як растлумачыць тое, што ён затрымлівае мікрааўтобус з віцебскімі журналістамі, каб яны не даехалі ў Мінск?

Самае цікавае, што ён сам усё разумее — і яму смешна! Але тым, хто сапраўды нацярпеўся ад сённяшняй улады, зусім нявесела.

Толькі калі дарасце народ да такіх тэрмінаў, як «дэмакратыя», «свабода», можа адбыцца нейкі зрух.

Але што такое свабода?

Для мяне свабода — гэта, калі не ведаеш, што такое жах, калі твае жаданні ўлічваюцца, калі ты адчуваеш сябе ўпэўненай асобай, а галоўнае — калі зверху табе не дыктуюць, што рабіць і як рабіць.

Няволя ў нашай дзяржаве адбіваецца на ўсіх, нават на побытавых рэчах. Напрыклад, я не магу свабодна слухаць тую музыку, якая мне падабаецца, чытаць тое, што падабаецца, пісаць, спяваць, гаварыць, глядзець.

Я вучуся ў школе ў дзесятым класе. Дзякуй Богу, мая настаўніца па гісторыі і ЧГД усё разумее. Пакуль мяне не прымушалі ілгаць. Але ў адзінаццатым класе ў мяне будзе такі «цудоўны» прадмет, як ідэалогія. Не ведаю, хто яго будзе выкладаць, але ўжо дакладна ведаю, як я буду сябе адчуваць. Шмат яшчэ чаго мяне чакае…

Нашу беларускую свабоду забівалі вельмі доўга. Гэта і падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне часткі Беларусі да Расійскай імперыі, гэта і ўлада царызму ў XIX стагоддзі, калі было забаронена нават ужываць назву «Беларусь», гэта і Савецкі Саюз.

Але скончыўся Саюз, скончылася перабудова, Беларусь атрымала незалежнасць і…